ПЕР. КОРОЛЕНКО 18
БИБ. КЕ. КОРОЛЕНКО
1.12 38

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 240 (6216) | 16 кастрычніка 1938 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Бывайце, дарагія сябры! Пісьмо гераічнага экіпажа «Родины».

Адважныя лётчыцы выехалі ў Хабараўск.

Перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва прадпрыемстваў БССР.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ:

І. В. Каралькоў — Выхоўваць студэнтаў у духу марксізма-ленінізма.

М. Зярніцкі — Недаацэнка важнейшай палітычнай справы.

С. Бабічаў — Дастойна рыхтуюцца да слаўнага 20-годдзя.

Сход партыйнага актыва Мозыра.

АРТЫКУЛЫ:

Камбрыг П. Гаршэнін — Абаронная работа — кроўная справа комсамольца.

Г. Дварэцкі — Комсамол у гераічных баях ля возера Хасан. Сын партызана.

П. Дзік — Да пытання аб сучаснай беларускай арфаграфіі.

С. Трэгуб — Біяграфія паэта.

Г. Таран, Ф. Канстанцінаў. — «Друзья».

П. Каскоў — Уборка бульбы не арганізавана.

С. Казначэеў — Патуруюць зрыўшчыкам дзяржаўных паставак.

Ал. Казей — Даходы калгасаў ад ільнаводства.

ЗА РУБЯЖОМ:

Сенацкія выбары ў Францыі.

У Берліне падрыхтоўваюць праблему Эльзас-Латарынгіі.

Становішча народнага фронта ў Францыі.

Аб'яднанне профсаюзаў у Чэхаславакіі.

Паход чэхаславацкай рэакцыі супроць компартыі.

Патрабаванні Венгрыі.

Дэманстрацыя украінскіх нацыяналістаў у Польшчы.

Прамова Негрына.

Заява Ю Хань-моу.

СМЯЛЕЙ АВАЛОДВАЦЬ ТЭОРЫЯЙ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА

Сотні тысяч партыйных і непартыйных большэвікоў ужо прыступілі да вывучэння гісторыі Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў). Вывучэнне гераічнай гісторыі партыі Леніна—Сталіна дапаможа нашым кадрам авалодаць большэвізмам, павысіць іх палітычную пільнасць, узброіць веданнем законаў развіцця грамадства, веданнем рухаючых сіл рэволюцыі.

Гісторыя ВКП(б) падагульвае каласальны вопыт барацьбы партыі Леніна—Сталіна за звяржэнне ўлады памешчыкаў і капіталістаў, за пабудову соцыялістычнага грамадства ў нашай краіне. На аснове гістарычных фактаў бліскуча пацвярджаецца правільнасць тэорыі марксізма-ленінізма, самай перадавой тэорыі, жыццёвай, пастаянна развіваючайся, удасканальваючайся, узбагачаючайся новым вопытам, новымі ведамі, тэорыі, прадстаўляючай баявое кіраўніцтва да дзеяння.

«Сіла марксісцка-ленінскай тэорыі,— гаворыцца ў гісторыі ВКП(б), — заставіць у тым, што яна дае партыі магчымасць арыентавацца ў абстаноўцы, зразумець унутраную сувязь акружаючых падзей, прадбачыць ход падзей і распазнаць не толькі тое, як і куды развіваюцца падзеі ў сучасным, але і тое, як і куды яны павінны развівацца ў будучым.

Толькі партыя, якая авалодала марксісцка-ленінскай тэорыяй, можа рухацца наперад упэўнена і весці рабочы клас наперад».

Кіруючы работнік, які не ведае тэорыі, вымушан, падобна сляпому, брадзіць вобмацкам, траціць перспектыву, упэўненасць у сваіх дзеяннях, нездолен весці за сабой масы.

Совецкі Саюз — дзяржава новага тыпу, нябачаная ў гісторыі чалавецтва. Каб паспяхова кіраваць такой дзяржавай, патрэбны значныя камандныя кадры, кадры, тэарэтычна падкаваныя, патрэбна свая совецкая інтэлігенцыя. Мы ў асноўным ажыццявілі першую, ніжэйшую фазу комунізма — соцыялістычнае грамадства, уступаем ужо ў вышэйшую фазу комунізма. Наша краіна існуе і развіваецца ў капіталістычным акружэнні; нямала за кардонам ворагаў, якія імкнуцца задушыць совецкую ўладу, аднавіць у СССР капіталістычны лад. Ва ўскладнёўшайся міжнароднай абстаноўцы, перад тварам велізарных задач будаўніцтва комунізма асабліва павышаецца адказнасць кожнага кіруючага работніка, кожнага актыўнага дзеяча нашай партыі. Бо кіраваць — значыць прадбачыць. А прадбачыць нельга, не ведаючы законаў развіцця грамадства. Таму задача авалодання марксісцка-ленінскай тэорыяй набывае зараз сугуба важнае значэнне.

Курс гісторыі Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў) — баявая тэарэтычная зброя, якую даў нашай партыі Сталінскі Цэнтральны Камітэт, — разлічан перш за ўсё на нашу совецкую інтэлігенцыю, на нашы кадры — партыйныя, совецкія, каапаратыўныя, прафсаюзныя, ваенныя, на работнікаў дзяржаўнага апарата, на ўсіх тых, хто ажыццяўляе функцыі кіравання ў нашай вялікай соцыялістычнай дзяржаве. Курс гісторыі ВКП(б) разлічан на навучаючыхся ў вышэйшых навучальных установах, якім прадстаіць стаць нашымі камандным кадрамі.

Тэарэтычныя асновы марксісцка-ленінскай партыі складаюць дыялектычны і гістарычны матэрыялізм. Засваенне гэтых асноў з'яўляецца абавязкам кожнага актыўнага дзеяча нашай партыі.

Іншым людзям здаецца, быццам авалодаць тэорыяй марксізма-ленінізма занадта цяжка і не ўсякаму пасільна. Няверна гэта! Не трэба баяцца тэорыі, веданне тэорыі — справа нажыўная. Маглі-ж нашы старыя большэвікі авалодаць тэорыяй, і не толькі авалодаць, але і ўмела карыстацца ёю ў барацьбе за перамогу пролетарыята, хаця ім давялося працаваць і вучыцца ў падполлі, у значна больш цяжкіх умовах, чым сучаснаму пакаленню. У нашай краіне, у наш час створаны ўсе спрыяючыя ўмовы для таго, каб няспынна і паспяхова вучыцца. Да паслуг таго, хто хоча вучыцца, — друк, кнігі, першакрыніцы марксізма-ленінізма, якія выдаюцца ў тыражах, не чуваных ніколі і ні ў адной краіне, велізарная сетка бібліятэк, арганізацыя лекцый, кансультацый, сетка ўсемагчымых курсаў.

Усе ўмовы для вучобы — у наяўнасці. Задача ў тым, каб прывучыцца працаваць над кнігай індывідуальна, самому. Так, самому! Нашы партыйныя арганізацыі, захапляючыся насаджэннем гурткоў, забывалі, што гуртковая форма прапаганды ва ўмовах совецкага ладу не можа і не павінна быць асноўнай, галоўнай. Гналіся за колькасцю слухачоў, забываючы аб якасці вучобы. Прымушаючы вучыцца ў прымусовым парадку, гым самым расхаладжвалі слухачоў, адбівалі ў іх ахвоту працаваць самастойна над кнігай, над павышэннем свайго палітычнага ўзроўню. Нявопытныя прапагандысты, нечотчыкі нярэдка засушвалі заняткі, выхалашчвалі з іх жывую душу, не ўмелі ставіць пытанні востра, жывацрапешчуча, цікава. Усеагульны і абавязковы «ахоп» гурткамі забіваў у слухачах веру ў магчымасць самому пасцігнуць законы грамадскага развіцця, самому пасцігнуць, вывучыць асновы марксізма-ленінізма, авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй. Вопыт лепшых прапагандыстаў не выходзіў за прэдзелы свайго гуртка. Такая арганізацыя прапаганды — самае непрыгляднае саматужніцтва і карысці справе ідэйна-палітычнага выхавання нашых кадраў яна прынесці не можа.

Упор павінен быць зроблен іменна на індывідуальную работу над кнігай, падручнікам, першакрыніцай марксізма-ленінізма. Курс гісторыі ВКП(б) з'яўляецца адной з такіх асноўных кніг. Авалодваючы марксісцка-ленінскай тэорыяй, трэба чытаць творы Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна. Кожны совецкі інтэлігент можа і павінен паставіць перад сабой задачу — прачытаць, вывучыць і асноўную работу Маркса—«Капітал». Нічога немагчымага, недасягальнага ў гэтай задачы няма.

Тэорыяй не авалодаеш, хватаючы яе на-ляту, наскокам. Авалодаць глыбока тэорыяй, — гэта значыць зразумець прачытанае да канца, прадумаць яго, асмысліць. Не «прапрацоўваць» (гэты распаўсюджаны тэрмін часта ўвасабляе ў сабе верхаглядства, спешку, слізганне па паверхні, неразуменне сутнасці пытання), а чытаць і сур'ёзна асмысліваць прачытанае — такава задача. Трэба, каб кожны совецкі інтэлігент набыў ахвоту да сістэматычнага чытання; патрэбнасць у чытанні павінна ўвайсці ў плоць і кроў, стаць штодзённай прывычкай, так, каб, прапусціўшы дзень—два, ён адчуваў што сёння ўпусціў зрабіць важную, неадкладную справу.

Трэба арганізаваць свой час так, каб выкраіць штодзённыя гадзіны для работы над сабой. Занадта многа ў нас траціцца каштоўнага часу даремна. Не навучыліся ў нас яшчэ даражыць мінутамі, ды ні толькі мінутамі, але і гадзінамі. Бескарысная трата часу, няўменне арганізаваць сваю працу, няўменне працаваць дзелавіта—гэта зло, якому пара абвясціць бязлітасную барацьбу.

Працаваць над сабой, авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй пасільна кожнаму совецкаму інтэлігенту. А найвялікшы выйгрыш для справы комунізма ад таго, што кадры авалодаюць тэорыяй марксізма-ленінізма, — відавочны.

«Я думаю, што калі-б мы змаглі, — гаварыў таварыш Сталін на лютаўска-сакавіцкім Пленуме ЦК ВКП(б) 1937 г., — калі-б мы здолелі нашы партыйныя кадры, знізу даверху, падрыхтаваць ідэалагічна і загартаваць іх палітычна такім чынам, каб яны маглі свабодна арыентавацца ва ўнутранай і міжнароднай абстаноўцы, калі-б мы здолелі зрабіць іх упаўне зрэлымі ленінцамі, марксістамі, здольнымі вырашаць без сур'ёзных памылак пытанні кіраўніцтва краінай, то мы вырашылі-б гэтым дзевяць дзесятых усіх нашых задач».

Курс гісторыі ВКП(б) дае нашым кадрам баявую гэарэтычную зброю. Навучымся-ж карыстацца гэтай зброяй, навучымся ўмела, творча яе прымяняць, каб павялічыць ва многа крат поспехі комунізма!

(«ПРАВДА»).

БЫВАЙЦЕ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

Пісьмо гераічнага экіпажа „Родины"

Уязджаючы з Комсамольска, гераічны экіпаж самалёта «Родина» звярнуўся да працоўных горада юнацтва з пісьмом, у якім гаворыцца:

«Бывайце, дарагія сябры!

Пакідаючы юны горад Комсамольск, мы яшчэ раз прыносім комсамольцам гарачую падзяку і сардэчнае дзякуй за дапамогу, аказаную нам, за ўвагу, за сустрэчу — цёплую і душэўную. Комсамольск зрабіў на нас уражанне вялікага горада — прамысловага і культурнага цэнтра Совецкага Далёкага Усхода. Заводы, школы, клубы, кварталы дамоў, створаныя вашымі рукамі, радуюць нас, як радуе ўсякі поспех нашай вялікай справы, справы соцыялістычнага будаўніцтва.

Нам спадабаўся ваш горад, таварышы. Ён стаў за гэтыя дні родным для нас. Комсамольск пабудован рукамі адважных комсамольцаў і комсамолак па ініцыятыве таварыша Сталіна, пры штодзённай яго дапамозе. Мы рады, што мелі магчымасць пабываць у гэтым горадзе, кароткая гісторыя якога поўна гераізма і адвагі маладых будаўнікоў. Мы сустракаліся тут з выдатнымі людзьмі, якія працуюць на вашых заводах, будоўлях, ва ўстановах. З такімі людзьмі — палкімі совецкімі патрыётамі — Комсамольск будзе быстра развівацца і далей, памнажаючы сваю магутнасць ва славу любімай соцыялістычнай радзімы.

Любіце свой горад, таварышы комсамольчане! Будуйце новыя заводы, пракладвайце новыя вуліцы, разбівайце паркі, штогадзінна мацуйце абароназдольнасць нашай краіны, працуйце так, як вучыць нас наш любімы правадыр таварыш Сталін, а мы, дарагія таварышы, з падзесяцяронай энергіяй возьмемся за работу, за вучобу, каб кожны наш крок праслаўляў вялікую краіну соцыялізма.

Бывайце, дарагія сябры!

Экіпаж самалёта «Родина»:
ГРЫЗАДУБАВА, ОСІПЕНКА, РАСКОВА».

Комсамольск-на-Амуры,
15 кастрычніка.

АДВАЖНЫЯ ЛЁТЧЫЦЫ ВЫЕХАЛІ Ў ХАБАРАЎСК

КОМСАМОЛЬСК-на-АМУРЫ, 15 кастрычніка. (БЕЛТА). Сёння працоўныя Комсамольска наладзілі ўрачыстыя провады гераічнаму экіпажу самалёта «Родина».

За гадзіну да адплыцця парахода дэлегацыі прадпрыемстваў, будоўляў, устаноў і навучальных устаноў сабраліся на прыстані. Тут адбыўся многалюдны мітынг.

Ад імя гарадской партыйнай арганізацыі і ўсіх працоўных Комсамольска адважных лётчыц тт. Грызадубаву, Осіпенка і Раскову вітае сакратар гарадскога камітэта партыі тав. Пегаў. Словы прывітання і самыя лепшыя пажаданні ад калектыва машынабудаўнічага завода перадае дарагім гасцям парторг цэха № 9 тав. Саседка. З яркай прамовай выступае стаханавец суднарамонтнага завода тав. Семчанка.

— Калектыў завода,—гаворыць ён, — жадае вам шчасліва даехаць да Масквы — сэрца нашай радзімы. Просім перадаць наша далёкаўсходняе большэвіцкае прывітанне нашаму ўраду і вялікаму Сталіну.

Выконваючы абавязкі старшыні горсавета тав. Васін ад імя працоўных Комсамольска прападносіць лётчыцам шкатулкі, на якіх паказаны карта Саюза з маршрутам пералёту, барэльефы Леніна і Сталіна, партрэты адважных гераінь тт. Грызадубавай, Осіпенка і Расковай.

З адказным словам выступіла тав. Осіпенка. Яна яшчэ раз перадала працоўным Комсамольска падзяку ўсяго экіпажа «Родины» за радушны прыём і выказала сваё захапленне прыгожым горадам, пабудаваным па волі партыі і пры бліжэйшай дапамозе таварыша Сталіна. Яна дае слова перадаць працоўным Масквы і таварышу Сталіну прывітанне комсамольчан.

У заключэнне тав. Осіпенка заклікала комсамольчан лепш працаваць, мацаваць абарону краіны, выкарчоўваць астаткі варожага ахвосця.

Мітынг закончыўся пад урачыстыя гукі «Інтэрнацыянала».

Працоўныя Комсамольска праводзілі адважных гераінь да дэбаркадэра. Доўга раздаваліся прывітальныя воклічы і пажаданні добрага шляху.



Лепшы стаханавец бабруйскага машынабудаўнічага завода імя Сталіна тав. Мац, які, працуючы на выпуску лапатак для гідратурбін, выканаў 7 кастрычніка дзённую норму на 1.374 проц. Фото Л. Мазелева (СФ).

ПАДХАПІЦЬ ПАЧЫН ВЫДАТНІКАЎ ЦЯЖКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Перадкастрычніцкае спаборніцтва, якое пачалося па ініцыятыве лепшых стаханаўцаў перадавых прадпрыемстваў, шырока разгарнулася на ўсіх фабрыках, заводах, промарцелях рэспублікі. Усюды мы сустракаемся з гарачым жаданнем азнаменаваць вялікае свята—XXI гадавіну Кастрычніка — новымі перамогамі. Гэты выдатны рух, у якім удзельнічаюць дзесяткі тысяч стаханаўцаў, ударнікаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і ў які з кожным днём уцягваюцца ўсё новыя масы рабочых і служачых, — праява глыбокага совецкага патрыятызма, гарачай любві да роднай большэвіцкай партыі і вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна.

У нашай рэспубліцы мы ўжо маем нямала прыкладаў, калі ў выніку разгарнуўшагася перадкастрычніцкага спаборніцтва многія брыгады, пралёты, змены, цэхі і прадпрыемствы пачалі працаваць лепш, паказваючы высокія ўзоры прадукцыйнасці працы. На бабруйскім машынабудаўнічым заводзе імя Сталіна комсамольская брыгада слесараў, дзе брыгадзірам з'яўляецца тав. Кібісаў, уключыўшыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, пачала намнога перавыконваць сваё вытворчае заданне. Былі дні, калі брыгада давала 500—600 процантаў нормы. Стаханавец-ліцейшчык тав. Перагуд, працуючы на фармоўцы каласнікоў 8 кастрычніка даў рэкордную выпрадоўку, выканаўшы норму на 1099 проц. Стаханавец гэтага-ж завода тав. Мац 7 кастрычніка выпусціў 75 лапатак для гідратурбін, выканаўшы дзённую норму на 1374 процанты.

Гомельская фабрыка імя Клары Цэткін выканала датэрмінова гадавы план. Такім-жа поспехам сустракаюць XXI гадавіну Кастрычніка рабочыя Менскага мясакамбіната і рад іншых прадпрыемстваў.

Шырока разгарнулася перадкастрычніцкае спаборніцтва сярод чыгуначнікаў.

З кожнай дэкадай распе колькасць машыністаў-вадзіцеляў цяжкіх паяздоў.

Разгортваецца перадкастрычніцкае спаборніцтва ў лясной прамысловасці па загатоўках і вывазцы лесу.

Важнейшая задача сёння — ператварыць перадкастрычніцкае спаборніцтва ў новы агульны ўздым усяго стаханаўскага руху.

Выдатны пачын у гэтай справе паказваюць стаханаўцы цяжкай прамысловасці, кіруемыя сталінскім наркомам Лазарам Майсеевічам Кагановічам. Днямі лепшыя стаханаўцы цяжкай прамысловасці звярнуліся з пісьмом да ўсіх рабочых і камандзіраў цяжкай прамысловасці, у якім пішуць:

«Перад намі стаіць зараз галоўная і асноўная задача: узняць новы этап стаханаўскага руху, перавесці стаханаўскі рух ад індывідуальнай стаханаўскай работы на рэйкі калектыўнай арганізацыі стаханаўскай работы цэлых брыгад, участкаў, цэхаў і прадпрыемстваў».

«Кожны з нас, — гаворыцца ў пісьме, — абавязваецца да Кастрычніцкіх свят навучыць стаханаўскім метадам работы не менш дзесяці рабочых».

Няма сумнення, што ініцыятыва стаханаўцаў-выдатнікаў цяжкай прамысловасці будзе шырока падхоплена стаханаўцамі і ўсімі рабочымі нашых прадпрыемстваў. У цэнтры перадкастрычніцкага спаборніцтва стаяць стаханаўцы, стаханаўскі рух у цэлым. І гэта зусім зразумела. Стаханаўцы — гэта цвет рабочага калектыва кожнага прадпрыемства. Паказваючы высокія ўзоры прадукцыйнасці працы, рухаючы наперад культуру вытворчасці, яны выступаюць застрэльшчыкамі ў арганізацыі соцыялістычнага спаборніцтва.

На менскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік» па ініцыятыве стаханаўцаў уведзены дзесяткі ўдасканаленняў у рабоце. Вывучэнне стаханаўскіх метадаў работы ўзняло культуру вытворчасці, павысіла прадукцыйнасць працы.

Год таму назад адзін рабочы абслугоўваў не больш 2—3 гофманскіх прэсаў. Стаханавец-уцюжчык першага цэха тав. Багамолаў па сваёй уласнай ініцыятыве рацыяналізаваў прыёмы работы, лепш арганізаваў рабочае месца і паступова перайшоў на абслугоўванне 7 прэсаў. Яго прыкладу і метадам работы паследвалі астатнія рабочыя-уцюжчыкі.

Сіла стаханаўскага руху ў яго масавасці. Заклік выдатнікаў цяжкай прамысловасці — перайсці да калектыўнай арганізацыі стаханаўскай работы, пачаць шырокую перадачу стаханаўскіх метадаў работы ўсім рабочым — мае велізарнае значэнне. Гэта ключ да ўздыму стаханаўскага руху на новую вышыню.

На менскіх і іншых фабрыках і заводах ёсць дзесяткі стаханаўцаў, якія перадаюць свой вопыт астатнім рабочым. Тав. Івашка (завод імя Варашылава), т. Канапацкі (завод «Большэвік»), т. Пінчук (завод імя Молатава), т. Бернштэйн (фабрыка імя Кагановіча), тт. Багамолаў, Хігеровіч, Сяргеева (фабрыка «Кастрычнік») і т. д. Але стаханаўцаў, перадаючых свой вопыт, яшчэ мала.

Вопыт перадавікоў павінен стаць здабыткам ўсёй масы рабочых. Узброіць перадавымі метадамі соцыялістычнай працы ўсіх рабочых — такая задача.

На нашых прадпрыемствах мы часта назіраем такі малюнак: на асобных участках ёсць выдатныя стаханаўскія пакаазальнікі; нават цэлыя цэхі перавыконваюць план, а прадпрыемства ў цэлым — у прарыве. Так, напрыклад, абстаіць справа на гомельскім паравоза-вагонарамонтным заводзе і на многіх іншых прадпрыемствах.

Свяшчэнны абавязак кожнай партыйнай арганізацыі, профсаюзаў, камандзіраў вытворчасці, інжынерна-тэхнічных работнікаў — узначаліць ініцыятыву стаханаўцаў, падхапіць вопыт выдатнікаў цяжкай прамысловасці і арганізаваць шырокі абмен вопытам стаханаўцаў. Стаханаўскія школы, індывідуальнае шэфства, лекцыі перадавых стаханаўцаў — усе гэтыя формы павінны быць скарыстаны для ўзбраення ўсіх рабочых соцыялістычнымі стаханаўскімі метадамі працы, для ператварэння змен, цэхаў і прадпрыемстваў у суцэльна стаханаўскія.

Шырэй разгорнем перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, уславім нашу любімую радзіму новымі стаханаўскімі перамогамі!

ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ БССР

ЗАКЛІК ЛЕПШЫХ СТАХАНАЎЦАЎ ЛЕСАЗАГАТОВАК

Днямі пры Наркамлесе БССР адбыўся сход актыва стаханаўцаў, інжынерна-тэхнічных работнікаў і гаспадарнікаў. Актыў звярнуўся в пісьмом да ўсіх работнікаў лясной прамысловасці аб разгортванні перадкастрычніцкага соцыялістычнага спаборніцтва на лесазагатоўках і лесавывазцы.

«У лясной прамысловасці, пішацца ў гэтым пісьме, ёсць асобныя прадпрыемствы, якія добра працуюць. Гэта — Асіпавіцкі і Аршанскі леспрамгасы, Гомельская сплаўкантора, Віцебскі лесараён і т. д. На лесараспрацоўках вырасла нямала выдатных стаханаўцаў. Трактарыст В. Юрчанка сістэматычна выконвае норму вывазкі драўніны на 250 проц. Лесаруб тав. Анішчанка — на 300 проц.

Аднак, не гледзячы на асобныя поспехі, лясная прамысловасць працуе вусім нездавальняюча, што абсалютна нецярпіма».

Удзельнікі актыва вызначылі асноўныя пункты перадкастрычніцкага спаборніцтва:

1. Неадкладна закончыць падрыхтоўку да асенне-зімовых лесазагатовак.
2. Да XXI гадавіны Кастрычніка выканаць не менш 50 проц. плана чацвертага квартала і гадавую праграму да гадавіны выбараў у Вярхоўны Совет СССР — 12 снежня.
3. Поўнасцю закончыць сплаў драўніны, не дапускаючы замярзання ні аднаго кубаметра.
4. Стварыць усе ўмовы для стаханаўскай работы і арганізаваць абмен вопытам лепшых стаханаўцаў.

ДАТЭРМІНОВА НА ТРЫ МЕСЯЦЫ ВЫКАНАЛІ ПЛАН

БАРЫСАЎ. Стаханаўскую сустрэчу рыхтуе гадавіне Вялікага Кастрычніка калектыў чыгуналіцейнага завода «Пролетарскі молат». Гадавую праграму завод выканаў на 3 месяцы раней тэрміну. Да канца года рабочы калектыў абавязаўся выпусціць звыш плана прадукцыі на 240 тысяч рублёў, у тым ліку на 150 тысяч рублёў запасных частак да сельскагаспадарчых машын.

У канцы верасня завод асвоіў выпуск валікаў і падшыпнікаў да ільнамялкі. Да канца года завод выпусціць 900 валікаў і 2.700 падшыпнікаў.

Многія рабочыя дабіліся высокай прадукцыйнасці працы. Фармаўшчыкі ліцейнага цэха тт. Крышталь, Шкарадзёнак і Баско выконваюць нормы на 200—210 процантаў. Комсамолец тав. Белькінд, працуючы на расточцы падшыпнікаў, расточвае ў змену 50 падшыпнікаў пры норме 17.

Начальнік механічнага цэха тав. Качан унёс каштоўную рацыяналізатарскую прапанову, якая дала магчымасць у два разы павялічыць выпуск спартыўных алюмініевых гранат, прычым у многа раз знізіўся процант адыходу алюмінія. Зараз завод выпускае 200 гранат штодзённа.

РАСТУЦЬ РАДЫ СТАХАНАЎЦАЎ

Рабочы калектыў віцебскай швейнай фабрыкі «Профінтэрн» шырока разгарнуў соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

Рабочыя цэха № 2 план за верасень месяц выканалі на 105,6 проц. Асабліва добра працуе ў гэтым цэху лента № 37 (майстар ленты тав. Беркоўскі). Гэта лента з'яўляецца суцэльна-стаханаўскай. У цэху вырасла многа новых стаханаўцаў: стаханаўка тав. Грышанава выконвае норму на 224 проц., Масленікава — на 239 проц. Стаханаўкі тт. Нэгелева, Ляхновіч, Цынман і іншыя выконваюць свае нормы на 200 і больш процантаў.

Наперадзе ідзе таксама ў выкананні сваіх соцыялістычных абавязацельстваў і цэх № 4, дзе начальнікам з'яўляецца тав. Лінкоўскі. За верасень цэх выканаў план на 104,8 проц., за першую дэкаду кастрычніка — на 108,3 проц. У гэтым цэху арганізаваны дзве комсамольска-маладзёжныя брыгады імя XX-годдзя ВЛКСМ. Спаборнічаючы паміж сабой, гэтыя брыгады паказваюць узоры высокай прадукцыйнасці працы. Так, брыгада тав. Дойлінай выканала план за верасень месяц на 112 проц., а за першыя 10 дзён кастрычніка — на 118 проц. Брыгада тав. Ганчаровай — адпаведна—на 115 і 116. Раней адставаўшая брыгада № 30 (брыгадзір тав. Абламунец) за першую дэкаду кастрычніка выканала праграму на 123 проц.

Рабочыя цэха № 4 ганараппа сваімі лепшымі стаханаўкамі тт. Білевіч, якая выконвае норму на 220 проц., Максімавай — на 170 проц.

ІОФЕ,
рэдактар шматтыражкі «Профінтэрнавец».

СХОД ПАРТЫЙНАГА АКТЫВА МОЗЫРА

14 кастрычніка адбыўся сход гарадскога і раённага партактыва мозырскай партарганізацыі. Прысутнічала 120 чалавек. З дакладам аб выніках III пленума ЦК КП(б)Б выступіў сакратар Палескага абкома КП(б)Б тав. Маркін. Ён расказаў актыву аб памылках, дапушчаных у абласной партарганізацыі пры ажыццяўленні рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б).

Па вобласці разгледжана 559 апеляцый выключаных з партыі. Адноўлена ў партыі 277 чалавек. Дакладчык указаў, што некаторыя райкомы несур'ёзна падышлі да разгляду апеляцый. У Хойніцкім раёне пасля другога перагляду апеляцый было адноўлена ў партыі 19 чалавек.

Ёсць факты прытуплення пільнасці. Лельчыцкі райком аднавіў у партыі нейкага Ж., які хутка пасля гэтага органамі НКВД быў выкрыт як вораг народа. Пярвічная партарганізацыя мозырскай фабрыкі «Профінтэрн» прыняла ў партыю неправераванага чалавека. Ён аказаўся замаскіраваным ворагам.

У спрэчках выступіла 14 чалавек. Таварышы рэзка крытыкавалі Мозырскі РК КП(б)Б за слабую работу па росту партыі і слабае кіраўніцтва комсамольскімі арганізацыямі. Комуністы ўказвалі, што райком не здолеў спалучыць палітычную работу з гаспадарчай.

Сход актыва адобрыў рашэнні пленума ЦК КП(б)Б і намеціў канкрэтныя мерапрыемствы па іх ажыццяўленню.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

ВЫХОЎВАЦЬ СТУДЭНТАЎ У ДУХУ МАРКСІЗМА-ЛЕНІНІЗМА

Беларускі політэхнічны інстытут штогод выпускае больш 100 высокакваліфікаваных спецыялістаў. Яго пітомцы займаюць адказныя пасты ў прамысловасці і совецкім апараце. Веды, атрыманыя за годы вучобы, прымяняюцца на практычнай рабоце ў самых рознастайных галінах народнай гаспадаркі.

Правільна прымяніць атрыманыя веды ў адпаведнасці з інтарэсамі нашай вялікай радзімы магчыма толькі ўзброіўшыся марксісцка-ленінскай тэорыяй. Таварыш Сталін яшчэ ў 1937 годзе ў сваёй гістарычнай прамове на нарадзе гаспадарнікаў гаварыў:

«Нам патрэбны тэхніка камандныя і інжынерна тэхнічныя сілы, якія здольны зразумець палітыку рабочага класа нашай краіны, здольны ўсвоіць гэту палітыку і гатовы ажыццявіць яе на совесць». (Сталін, «Пытанні ленінізма», выд. 10, стар. 457).

Толькі глыбокае веданне вучэння марксізма-ленінізма дасць магчымасць совецкаму спецыялісту дакладна разумець абстаноўку і прадбачыць яе далейшае развіццё. Гэта дапаможа яму скарыстаць атрыманыя веды на карысць нашай краіны найбольш рацыянальна, з найвялікшай эфектыўнасцю.

Як-жа забяспечвае партыйная арганізацыя марксісцка-ленінскае выхаванне студэнтаў?

Вывучэнне сацыяльна-эканамічных дысцыплін, фармуючых марксісцка-ленінскі светапогляд студэнтаў, складаецца з праходжання курсаў палітычнай эканоміі, ленінізма, гістарычнага і дыялектычнага матэрыялізма. Гэтыя адказнейшыя дысцыпліны ў мінулыя годы амаль не вывучаліся. Так, на курс палітычнай эканоміі адводзілася толькі 120 гадзін. Зразумела, што за такі кароткі тэрмін немагчыма глыбокае вывучэнне марксізма-ленінізма.

У гэтым вучэбным годзе на вывучэнне палітычнай эканоміі адведзена 160 гадзін, з іх 40 — на самастойную прапрацоўку. Гэта дасць магчымасць студэнтам больш дэталёва азнаёміцца з творамі Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Гэтага часу зусім недастаткова. Было-б жадэанна, калі-б партыйная арганізацыя найшла формы дапамогі студэнтам, жадаючым больш дэталёва азнаёміцца з класікамі палітэканоміі, зразумела, не без удзелу навуковых работнікаў кафедры сацыяльна-эканамічных дысцыплін.

Лепш абстаіць справа з вывучэннем гістарычнага і дыялектычнага матэрыялізма. На вывучэнне адведзена 140 гадзін, замест 80 у мінулым годзе. Таксама павялічан у гэтым годзе да 90 гадзін курс ленінізма, замест 60 у мінулым.

Новыя праграмы па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах адсутнічаюць. Павялічаныя курсы чытаюцца па старых праграмах. Таму навуковыя работнікі павінны скарыстаць дадатковыя гадзіны на ўсебаковую прапрацоўку найбольш важных раздзелаў курса. Набывае асаблівае значэнне кабінет па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах, які абавязан дапамагчы навуковым работнікам лепш падрыхтавацца да лекцый. На жаль, кабінет не арганізаван, хаця адпаведныя сродкі асігнаваны.

Інстытут мае асігнаванні на пагадзінную аплату 188 лекцыйных гадзін. Гэтыя асігнаванні мяркуецца скарыстаць на арганізацыю лекцый для студэнтаў па гісторыі ВКП(б) і іншых галінах сацыяльна-эканамічных дысцыплін. Абавязак кіраўніцтва інстытута — забяспечыць гэтыя лекцыі высокакваліфікаванымі выкладчыкамі.

Выпуск у свет новага сталінскага падручніка па гісторыі ВКП(б) студэнты сустрэлі з небывалым палітычным уздымам. Яны з захапленнем чыталі ў газетах слаўную гісторыю большэвізма. Большая частка студэнтаў набыла падручнік, ці журнал «Партийное строительство», у якім змешчан Кароткі курс гісторыі ВКП(б), і зараз індывідуальна знаёмяцца з гэтым каштоўным гэарэтычным дакументам.

Партыйны камітэт палабраў прапагандыстаў арганізаваў для іх семінары. У хуткім часе ў школах і гуртках студэнты распачнуць вывучэнне гісторыі ВКП(б).

Вывучэнне гісторыі ВКП(б) толькі ў гуртках зусім недастаткова. Студэнты чакаюць, што Камітэт па справах вышэйшай школы пры СНК БССР павінен прадугледзець уключэнне Кароткага курса гісторыі ВКП(б) у вучэбную праграму інстытута. Гэта дапаможа студэнтам і навуковым работнікам у авалоданні большэвізмам, у марксісцка-ленінскім выхаванні.

Разам з вывучэннем сацыяльна-эканамічных дысцыплін, разам з авалоданнем тэхнічнымі ведамі, партарганізацыя праводзіць для студэнтаў выклекцый і дакладаў. Актыўна наведваюць студэнты адкрытыя партыйныя сходы, дзе слухаюць даклады аб міжнародным становішчы.

Моладзь інстытута прымае актыўны ўдзел у рабоце па ўмацаванню абароназдольнасці нашай краіны. На сходы Асоавіяхіма, на якіх былі зроблены даклады аб міжнародным становішчы, з'явіліся дзесяткі слухачоў. Студэнты авалодваюць ваеннай тэхнікай. Сярод іх — дзесяткі пілотаў, шофераў, планерыстаў, снайпераў і т. д. Гэтыя каштоўныя для нашай радзімы спецыяльнасці яны набылі без адрыву ад вучобы.

У пачатку вучэбнага года арганізаван рад гурткоў самадзейнасці: ансамбль народных інструментаў, ансамбль народнай песні і танца. У моладзі вялікае жаданне арганізаваць драматычны гурток.

У інстытуце арганізавана футбольная і валейбольная каманды, якія не раз заваёўвалі пяршынства на вузаўскіх і профсаюзных спаборніцтвах. Аднак, фізкультурная работа яшчэ не перабудавана ў адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб выкладанні фізічнай культуры ў вышэйшых навучальных установах.

Перад партыйнай арганізацыяй інстытута стаіць адказная задача — падрыхтаваць усебакова граматных спецыялістаў, інжынераў для народнай гаспадаркі нашай краіны. У гэтым партарганізацыі павінны аказаць вялікую дапамогу райком і гарком партыі. Аднак сакратары Варашылаўскага райкома партыі вельмі рэдкія госці ў партарганізацыі, а работнікі гаркома амаль ніколі не бываюць у інстытуце. Нават пытанні, узнятыя перад гаркомам, вельмі актуальныя для інстытута, асталіся без адпаведнага рэагавання.

Аддзел школ і навукі ЦК КП(б)Б таксама не наладзіў дыферэнцыяванага кіраўніцтва партыйнымі арганізацыямі навучальных устаноў. Трэба ліквідаваць недахопы ў кіраўніцтве інстытутамі, дапамагчы партарганізацыям выхаваць совецкае студэнцтва ў духу марксізма-ленінізма.

І. В. КАРАЛЬКОЎ,
член парткома Беларускага політэхнічнага інстытута.

НЕДААЦЭНКА ВАЖНЕЙШАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ СПРАВЫ

У Аршанскай раённай партарганізацыі, як і ў іншых партарганізацыях, кожны нумар «Правды», дзе друкаваліся асобныя раздзелы Кароткага курса гісторыі ВКП(б), сустракаўся з велізарным палітычным уздымам. Комуністы і бесспартыйныя прагна чыталі выдатныя раздзелы баявой гісторыі партыі Леніна — Сталіна.

Зусім відавочна выключнае значэнне работы па падрыхтоўцы партарганізацый да глыбокага вывучэння гісторыі партыі. Падрыхтаваць прапагандыстаў, падрыхтаваць да заняткаў усіх комуністаў — вось задача райкома партыі.

Што-ж зроблена райкомам для выканання гэтага?

Не гледзячы на тое, што скора распачнецца глыбокае вывучэнне Кароткага курса гісторыі ВКП(б), у школах і гуртках райкомам нічога яшчэ не зроблена, каб арганізаваць па-сур'ёзнаму падрыхтоўку да вывучэння гісторыі партыі.

Нельга-ж, на самай справе, лічыць праведзеную райкомам 15 верасня нараду прапагандыстаў (на якую, да рэчы сказаць, з'явілася вельмі мала прапагандыстаў), як работу, якою вычэрпваюцца падрыхтоўчыя мерапрыемствы да глыбокага вывучэння Кароткага курса гісторыі ВКП(б). А між тым, далей гэтай нарады райком не пайшоў.

Да сённяшняга дня ніхто з райкома партыі не гутарыў з кожным прапагандыстам паасобку не цікавіўся яго падрыхтоўкай, яго запатрабаваннямі. Дасканалага спіса, хто ўваходзіць у склад раённага семінара прапагандыстаў, яшчэ няма. Мы ўжо не гаворым аб вылучэнні райкомам партыі на прапагандысцкую работу новых вырасшых кадраў, што з'яўляецца надзвычай важнай партыйна-палітычнай справай.

Сетка гурткоў партасветы, кіраўніцтва гурткоў на бюро РК КП(б)Б не абмяркоўваліся. Нават аб кіраўніках пропсемінараў у такіх буйных партарганізацыях, як БелДРЭС і Асінторф, райком партыі да гэтага часу не вырашыў пытання.

Па-за ўвагаю райкома астаўся такі важны атрад совецкай інтэлігенцыі, як настаўніцтва, якому партыяй і ўрадам даручана адказнейшая справа выхавання ў совецкіх школах маладых патрыётаў нашай радзімы. Канкрэтных заходаў да арганізацыі вывучэння настаўніцтвам гісторыі большэвізма — пакуль-што не прынята.

Культпроп райкома тав. Палес па ўсіх гэтых пытаннях не праяўляе напорыстасці, аператыўнасці, не дабіваецца, каб неадкладна вырашыць іх на бюро РК КП(б)Б.

Першыя заняткі раённага семінара прапагандыстаў па вывучэнню першага раздзела гісторыі партыі прайшлі неарганізавана. Пачатак заняткаў быў прызначаны на 10 гадзін раніцы. Да гэтага часу з'явілася некалькі чалавек.

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што РК КП(б)Б і сакратар райкома партыі тав. Бас недаацэньваюць важнейшую справу — падрыхтоўку партарганізацыі да глыбокага вывучэння гісторыі ВКП(б).

М. ЗЯРНІЦКІ.

ДАСТОЙНА РЫХТУЮЦЦА ДА СЛАЎНАГА ДВАЦЦАЦІГОДДЗЯ

Чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі часці, шырока разгарнулі сацыялістычнае спаборніцтва паміж падраздзяленнямі на дастойную сустрэчу дваццацігоддзя Ленінска-Сталінскага комсамола.

У падраздзяленні спаборнічаюць усе камандзіры і чырвонаармейцы. Спаборніцтва ўзначальваюць комсамольцы, прыклад з якіх бярэ несаюзная моладзь. Палітрук тав. Земчэнкаў рэгулярна падводзіць вынікі спаборніцтва. Гэта прымушае адстаючых таварышаў падцягнуцца да ўзроўню перадавых.

Малодшы камандзір тав. Квірквілія, па нацыянальнасці грузін, слаба ведаў рускую мову, з-за чаго адставаў у вучобе. Тав. Квірквілія пачаў спаборнічаць з комсамольцам Палотаевым, які навучыў яго па-руску гаварыць. Зараз тав. Квірквілія добра ведае рускую мову і па палітвучобе з'яўляецца перадавым, актыўна пачаў удзельнічаць у грамадскім жыцці.

У падраздзяленні, дзе камандзірам тав. Сабалеўскі, усе байцы і камандзіры ўзялі абавязацельства мець толькі выдатныя паказальнікі ў рабоце і вучобе. Чырвонаармейцы тт. Сарокін, Чэрноў, Дзергуноў свае абавязацельствы выконваюць, паказваюць прыклад высокай дысцыпліванасці. Палітрук тав. Біцюкоў і комсорг тав. Бражнікаў рэгулярна падводзяць вынікі заўважваюць недахопы і ўказваюць шляхі іх выпраўлення.

С. БАБІЧЭУ.

УДЗЕЛЬНІКІ ГЕРАІЧНЫХ БАЕЎ У РАЁНЕ ВОЗЕРА ХАСАН. Малодшыя камандзіры Н. М. Гурэеў і А. К. Варашылін расказваюць групе дэлегатак першай краявой нарады хетагуравак аб разгроме японскіх самураяў. НА ЗДЫМКУ (злева направа): малодшы камандзір Н. М. Гурэеў, Р. А. Арцімовіч, малодшы камандзір А. К. Варашылін, А. Е. Белова, З. І. Сокалава, М. С. Жарыкава (работніцы Сахалінскіх нафтапромыслаў).
Фото Образцова (СФ).

КОМСАМОЛ У ГЕРАІЧНЫХ БАЯХ ЛЯ ВОЗЕРА ХАСАН

СЫН ПАРТЫЗАНА

Часта па вечарах Пеця не даваў свайму бацьку спакою.

— Тата, ну, раскажы, як білі белых генералаў, — настойліва прыставаў ён. Бацька ведаў, што сын не адстане, пакуль ён яму не раскажа тое, што ім ужо было не раз пераказана. І ён зноў пачынаў расказваць аб партызанскім жыцці ў чароўнай тайзе, як партызаны па начах раптоўна нападалі на банды белых генералаў і бязлітасна іх грамілі.

З вялікай увагаю слухаў Пеця бацьку-партызана. А ў канцы расказа, моцна ўзбуджаны, пытаў:

— А не страшна было, калі вас белыя вялі на расстрэл?

— А чаго-ж было страшыцца, мы-ж, Пеця, рэволюцыю тады ратавалі, жыццё шчасліва заваёўвалі. Калі нас вялі на расстрэл, мы рэволюцыйныя песні спявалі, генералаў праклінялі.

— А, напэўна, боль быў, калі пальцы рубілі і рукі ламалі? — прадаўжаў запытваць Пеця і пры гэтым свой дзіцячы позірк накіроўваў на пакалечаныя пры катаванні рукі бацькі.

— Наконт болю нешта не помню, але вось зло на белых генералаў было сільнае, у рожу катам пляваў...

Пеця слухаў і думаў, што і ён будзе такім бясстрашным, храбрым, як яго бацька...

За вучобаю ў школе, за работаю на заводзе непрыкметна прайшло шчаслівае дзяцінства і настаў радасны дзень юнака — прызыў у Чырвоную Армію. Прызыўніку Пятру Есікаву прадастаўлялася ільгота, але ён катэгарычна адмовіўся і настойліва патрабаваў, каб яго прынялі ў армію. Есікаў быў залічан у адну з часцей на Далёкім Усходзе. Ён кончыў палкавую школу, быў назначан камандзірам аддзялення. Па сканчэнні тэрміну службы астаўся пажыццёва ў кадрах Чырвонай Арміі. Быў паслан на курсы малодшых лейтэнантаў, з поспехам іх кончыў і атрымаў званне малодшага лейтэнанта.

...Ярка свяціла сонца. Быў гарачы жнівеньскі дзень. У раёне возера Хасан ішла моцная страляніна з гармат. Японская ваеншчына яшчэ раз рашыла справакаваць Совецкі Саюз на вайну. Наглыя самураі нарушылі нашы граніцы, напрабавалі ўварвацца на совецкую тэрыторыю.

Рота атрымала загад: заняць зыходнае становішча для наступлення. М'тынг закончыць не ўдалося: пачалі блізка ўкацца самурайскія снарады. Але глыбока ў свядомасць байцоў увайшлі словы камандзіра Есікава: «Мы ідзем абараняць радзіму. За радаснае жыццё, за вялікага Сталіна не пашкадуем сіл сваіх, а калі давядзецца памерці — памром смерцю храбрых сыноў сацыялістычнай радзімы».

— Правільна. Разграмім самураяў! Пакажам фашысцкаму зброду, што значыць нападаць на совецкую зямлю! — чутны былі шматлікія ўзбуджаныя галасы байцоў.

Пад артылерыйскім агнём рота разгарнулася па ўзводах, узводы — па аддзяленнях. Пачалося імклівае наступленне. Падраздзяленне тав. Есікава было напраўляючым. Камандзір кулямётнага ўзвода тав. Крывашэеў быстра заняў паказаны рубеж і адкрыў з кулямётаў агонь па праціўніку. Стралковыя ўзводы пачалі рухацца наперад. Есікаў ідзе ў бой з перадавым узводам, якім камандуе малодшы комузвод Шадрын. Занялі адваротны скат. Самураі вядуць шалёны агонь з кулямётаў. Станкавы кулямёт праціўніка перашкаджае прасоўванню роты. Японскі кулямётчык замаскаваўся. Ручны кулямётчык Цімашэнка пусціў па яму некалькі вочарадзей, але кулямёт ворага прадаўжаў страчыць. Есікаў быстра кладзецца за кулямёт. Дакладна вызначана адлегласць. Верны пастаўлен прыцэл.

— Па ворагу агонь! — падаў каманду Есікаў і ўпэўнена націснуў на спускавы кручок. Паслушна загаварыў кулямёт. Некалькі трапных вочарадзей — і станкавы кулямёт самураяў замоўк.

— Рота, наперад! — камандуе Есікаў. І сам першым робіць перабежку ў лагчыну. Аддзяленне быстра займае новы рубеж. У лагчыне тав. Есікаў бачыць як, папаўшы ў багнішча, застраў танк.

— Камандзіру аддзялення Марозаву са сваімі байцамі адправіцца на выручку танка, — перадае загад тав. Есікаў. Падкінуўшы пад гусеніцы танка ламачча і травы, байцы дапамаглі танку выбрацца з дрыгвы. За прыкрыццем танка рота пачала быстра прасоўвацца наперад.

Дасягнута дротавая загарода. Танк праходзіць па спехам зробленай загародзе, робіць свабодны праход. Зусім радам акопы. З іх самураі вядуць агонь з вінтовак і кідаюць гранаты.

— Гранатамётчыкі, да мяне! — камандуе Есікаў. Ён аб'ядноўвае гранатамётчыкаў у адну групу і сам кіруе іх агнём. Трапна кідаюць у акопы самураяў гранаты Оскараў, Цітоў, Кулямётчыкі Гасімаў, Бартоў, Дрожнікаў косяць ворага кулямётным агнём. Усё слабей і слабей становіцца агонь з акопаў праціўніка. Момант атакі настаў.

— Падрыхтавацца да атакі! — загадвае тав. Есікаў. Байцы правяраюць штыхі. Рыхтуюць ручныя гранаты.

— У атаку! За мной, наперад! — Есікаў з вінтоўкай у руках кідаецца наперад. За ім з магутным «ура» кідаюцца ў атаку байцы роты. У акопы самураяў градам ляцяць ручныя гранаты. Самураі выскакваюць з акопаў і ў паніцы бягуць. Іх насцігаюць кулі. Застраўшых у акопу байцы пракончваюць штыхамі. У акопу астаўся ранены японскі афіцэр. На ломанай рускай мове ён у страху вішчыць: «Мая не працуе». Але здорава працуе штых вінтоўкі чырвонага байца.

Рота дасягнула вяршыны сопкі. Заазёрнай Есікаву ставіцца новая задача:

— Разведаць правы фланг. Марудзіць нельга. Праціўнік можа скарыстаць адкрыты флант і нанесці ўдар.

Есікаў быстра прыступае да выканання пастаўленай задачы.

Зноў гучыць каманда: «За мной!». На правым флангу яшчэ няма нашых часцей. Праціўнік, не адважваючыся перайсці ў контратаку, сустрэў роту моцным гранатным і ружэйным агнём. Па сталёвай касцы ўдарыў асколак гранаты. Але Есікаў не звяртае ўвагі ні на кулі, ні на завыванне асколкаў гранат. Было горача, ён расшпіліў каўнер гімнасёркі. У роце суха, голас рабіўся сіплым. Але ён не пераставаў камандаваць і кіраваць боем.

Зусім радам змоўк кулямёт Дрожнікава. Есікаў падпоўз да кулямёта і адкрыў агонь па агнявых пунктах праціўніка. Але вось дыскі з патронамі ўсе. Есікаў кладзецца за станкавы кулямёт і прадаўжае стральбу. З параадводнай адгуліны ідзе пара, але кулямёт не змаўкаючы, строчыць. Самура!, бачачы, што тут невялікая група, прабавалі перайсці ў атаку, але былі прыціснуты кулямётным агнём Есікава.

Кулямёт Есікава змоўк толькі тады, калі каля адважнага камандзіра-кулямётчыка разарваліся адразу дзве гранаты і ён страціў прытомнасць. У гэты час падаспелі нашы часці, і вораг быў разгромлен.

Так храбра біўся сын партызана малодшы лейтэнант комсамолец Есікаў Пётр Пятровіч.

Г. ДВАРЭЦКІ.

(З газеты «Тревога», № 214).

АБАРОННАЯ РАБОТА — КРОЎНАЯ СПРАВА КОМСАМОЛЬЦА

Камбрыг П. ГАРШЭНІН
Старшыня Цэнтральнага Совета Асоавіяхіма СССР.

Комсамол аказвае партыі Леніна—Сталіна актыўную дапамогу ва ўмацаванні ўзброеных сіл совецкай краіны. Гэта — адна з слаўных традыцый комсамола. Яна зарадзілася яшчэ ў эпоху грамадзянскай вайны, у тыя грозныя годы, калі ўступіць у комсамол азначала паехаць байцом на фронт. Кроўю лепшых сваіх сыноў, якія загінулі ў баях з інтэрвентамі і белагвардзейцамі, змацаваў Ленінска-Сталінскі комсамол сваю неразрыўную сувязь з Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй.

Шаснаццаць год шэфствуе комсамол над марскім флотам вялікай совецкай дзяржавы. Больш сямі год ажыццяўляе ён шэфства над ваенна-паветранымі сіламі СССР. Тысячы слаўных сталінскіх сокалаў, тысячы адважных маракоў, тысячы доблесных камандзіраў нашай непераможнай авіяцыі, нашага магутнага марскога флота даў сваёй радзіме комсамол. Зараз у радах Чырвонай Арміі і Флота поўмільёна комсамольцаў.

«Комсамольцы Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота — гэта — выдатны, залаты фонд абароны дзяржавы працоўных» (К. Е. Варашылаў).

Праграма комсамола разгледжвае садзейнічанне совецкай дзяржаве ва ўмацаванні і развіцці ўзброеных сіл як «важнейшы абавязак ленінскага комсамола». У праграме гэтай сказана: «ВЛКСМ вядзе сярод моладзі прапаганду ваенных ведаў, актыўна ўдзельнічае ў рабоце грамадскіх абаронных арганізацый і дабіваецца, каб кожны комсамолец яшчэ да ўступлення ў рады арміі і флота авалодаў майстэрствам меткай стральбы, вывучыў адну з ваенных спецыяльнасцей».

Падрыхтоўка папаўнення Чырвонай Арміі, ваеннае абучэнне саюзнай і несаюзнай моладзі заўсёды ўваходзіла важнейшай састаўной часткай у работу комсамола па ўмацаванню абароназдольнасці нашай радзімы. Комсамол змагаецца за тое, каб кожны малады чалавек краіны сацыялізма вывучаў ваенную справу.

Ваенная работа комсамола, — слаўная старонка ў яго жыцці. Ад выпадковых страявых заняткаў, ваенізаваных прагулак, лекцый па ваенных пытаннях комсамол перайшоў да больш сістэматычнай ваеннай падрыхтоўкі моладзі. У 1932—1936 годах комсамольскія арганізацыі не без поспеху праводзілі так называемы ваенна-тэхнічны экзамен. Экзамен спрыяў масаваму распаўсюджванню элементарных ваенных ведаў сярод членаў комсамола. Да X свайго з'езда комсамол разам з Асоавіяхімам падрыхтаваў сотні тысяч варашылаўскіх стралкоў. Мноства таварышаў здалі нормы процівапаветранай і хімічнай абароны, абучаны догляду за канём і т. д. Дзесяткі тысяч комсамольцаў здалі экзамен у веданні тапаграфіі, авіяматора, ва ўменні рабіць практыкаванні на планеры.

У той-жа перыяд Ленінска-Сталінскі комсамол узяў на сябе ініцыятыву шырокага развіцця сярод моладзі авіяцыйнага спорта. Па пачыну комсамола пачалі стварацца па ўсёй краіне аэраклубы, у якіх рабочая і калгасная моладзь без адрыву ад вытворчасці вучыцца лятаць на самалётах. Комсамолу належыць заслуга развіцця ў СССР парашутызма, атрымаўшага ў нас такі размах, якога не ведае ні адна краіна ў свеце.

Аднак вынік ваенна-тэхнічнага экзамена, поспехі совецкіх парашутыстаў, першыя групы комсамольцаў-пілотаў не маглі задаволіць растучых запатрабаванняў Чырвонай Арміі, авіяцыі і флота. Таму X з'езд комсамола высоўвае перад кожным комсамольцам задачу — набыць «другую прафесію», стаць спецыялістам у той ці іншай галіне ваеннай справы.

За час спаборніцтва аэраклубаў у гонар XX гадавіны ВЛКСМ тысячы комсамольцаў-вучлётаў датэрмінова здалі залікі на пілотаў, тэхнікаў, інструктараў, парашутыстаў-спартсменаў. Комсамольцы многіх аэраклубаў датэрмінова выканалі заданне па падрыхтоўцы авіяцыйных спецыялістаў. Аэраклубы Ленінградскай вобласці (Тосненскі, Чудоўскі, Ноўгародскі, Ленінградскі-гарадскі), а таксама Владзімірскі, Віцебскі, Саранскі, Кутаіскі і Акцябрскі аэраклубы горада Масквы ідуць наперадзе. На два месяцы раней тэрміну яны закончылі выкананне задання па падрыхтоўцы авіякадраў. Комсамольцы, моладзь гэтых аэраклубаў здалі залікі на выдатна і добра.

Але не ўсюды справа ідзе так гладка. У падрыхтоўцы авіяцыйных спецыялістаў адстаюць арганізацыі Асоавіяхіма і комсамола Украіны (Сталінская і Варашылаўградская вобласці), а таксама аэраклубы Далёкага Усхода, Казахстана, Арменіі, Чэлябінскай і Калінінскай абласцей. У гэтых аэраклубах камандна-палітычны і лётна-тэхнічны састаў недастаткова мабілізаван на выкананне плана, масава-палітычная работа не разгорнута па-сапраўднаму.

У большасці аэраклубаў дрэнна абстаіць справа з трэніроўкай пілотаў. Правільна крытыкуюць Цэнтральны Совет Асоавіяхіма за тое, што ён не ўдзяляе гэтаму пытанню сур'ёзнай увагі. Задача комсамольскіх і асоавіяхімаўскіх арганізацый — забяспечыць выкананне задання па падрыхтоўцы ўсіх авіяцыйных спецыялістаў, арганізаваць трэніроўку пілотаў ва ўсіх аэраклубах. Трэба дабіцца, каб у нас у краіне не было ні аднаго пілота-лётчыка, які не праходзіў-бы сістэматычнай трэніроўкі. Матэрыяльная часць і кадры інструктараў для гэтага ёсць. Комсамольскія арганізацыі павінны дапамагчы Асоавіяхіму ў падрыхтоўцы да новага навучальнага года аэраклубаў: укамплектаваць усе вучэбныя групы аэраклубаў лепшымі комсамольцамі, падняць палітычную работу, дабіцца большай дысцыпліны і парадку ў аэраклубах.

Праведзеная ў жніўні-верасні бягучага года стралковая спартакіяда народаў СССР паказала значныя поспехі совецкіх стралкоў. Бліскучай перамогай закончылася апошняе выступленне нашых стралкоў, у большасці комсамольцаў, на завочным міжнародным спаборніцтве. З 205 каманд розных краін, якія ўдзельнічалі ў спаборніцтве, 11 былі прадстаўлены СССР. Першыя шэсць месц былі адваяваны совецкімі камандамі. Астатнія пяць совецкіх каманд занялі месцы не далей шаснаццатага.

Дапамагаючы Асоавіяхіму ў разгортванні масавага стралковага спорта, комсамольскія арганізацыі павінны сканцэнтраваць сваю асноўную ўвагу на стварэнні стралковых школ-клубаў, дзе моладзь навучалася-б майстэрству снайперскай стральбы з вінтоўкі і кулямёта.

Ва многіх арганізацыях Асоавіяхіма Масквы, Ленінграда, Беларусі, Украіны разгортваецца цікавы і карысны для ўмацавання абароназдольнасці краіны рух. Скарыстоўваючы вопыт агітацыйнай работы ў час выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР, саюзных і аўтаномных рэспублік, комсамольцы і актывісты Асоавіяхіма пайшлі ў дамы і інтэрнаты для азнаямлення працоўных з процівагазам і правіламі паводзін у выпадку паветранай трывогі, для абучэння іх барацьбе з вынікамі паветранага налёту. Вопыт гэтых агітатараў трэба падхапіць усім комсамольцам і асоавіяхімаўцам. Кожны грамадзянін нашай краіны павінен мець мінімум ведаў па процівапаветранай і хімічнай абароне.

З усіх куткоў неабсяжнай совецкай краіны паступаюць весткі аб поспехах комсамольцаў у абароннай вучобе. У адным з цэхаў машынабудаўнічага завода горада Комсамольска створаны гурткі пілотаў і штурманаў. Хабараўскі гарадскі камітэт комсамола арганізаваў курсы чырвоных медыцынскіх сясцёр. На адным з буйнейшых прадпрыемстваў Далёкага Усхода — маслатлушчакамбінаце імя Мікаяна з 139 комсамольцаў 56 маюць ваенныя спецыяльнасці — лётчыкаў, хімікаў, снайпераў, разведчыкаў.

Шмат новых цікавых форм абаронай работы сярод моладзі прымяняюць арганізацыі комсамола і Асоавіяхіма. У Смаленску гарком комсамола і абласны совет Асоавіяхіма правялі 30 верасня ваенна-тактычную гульню «Абарона Смаленска», у якой удзельнічала каля 7 тысяч чалавек. Тактычную гульню і паход правялі 2.900 студэнтаў, аспірантаў і навуковых работнікаў Маскоўскага універсітэта. Па ініцыятыве Таганскага райкома партыі горада Масквы днямі адбыўся вучэбны ваенізаваны паход у процівагазах, у якім удзельнічала 14 тысяч чалавек.

У адказ на пісьмо ўдзельнікаў баёў у раёне возера Хасан, па ініцыятыве рабочых варашылаўградскага паравозабудаўнічага завода пачалося ўсесаюзнае спаборніцтва асоавіяхімаўскіх арганізацый.

Наш любімы настаўнік і правадыр вялікі Сталін заклікае ўвесь совецкі народ да мабілізацыйнай гатоўнасці. Гэта абавязвае кожнага маладога грамадзяніна нашай радзімы сур'ёзна, штодзённа вывучаць ваенную справу. Асноўнае, да чаго павінна імкнуцца кожная арганізацыя комсамола, — каб кожны комсамолец меў ваенную спецыяльнасць. Кожны комсамолец павінен быць або лётчыкам, або танкістам, або артылерыстам, або кулямётчыкам, або мараком.

Партыя, урад і народ даверылі Асоавіяхіму справу велізарнай важнасці — рыхтаваць совецкіх грамадзян да абароны сваёй соцыялістычнай бацькаўшчыны, прадаставілі яму вялікую матэрыяльную базу. Арганізацыі Асоавіяхіма павінны стаць непрыступнымі для ворагаў і іх агентаў, для чуждых справе соцыялізма людзей. Асоавіяхім мае ўсе магчымасці для таго, каб працаваць значна лепш.

Кроўны абавязак кожнага комсамольца і ўсіх комсамольскіх арганізацый — мацаваць Асоавіяхім — масавую абаронную арганізацыю совецкага народа.

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

ПАДРЫХТАВАЦЬ ІНТЭРНАТ ДА ЗІМЫ

Белпромбудтрэст вядзе будаўніцтва фурнітурнага завода. Пры будаўніцтве ёсць інтэрнат, у якім жыве каля 400 рабочых. У вялікіх пакоях жывуць па 50 і больш чалавек. Усюды вельмі нячыста. У мужчынскіх пакоях жывуць таксама жанчыны з груднымі дзецьмі. Тут-жа гатуюць страву. Столь амаль ва ўсіх пакоях працякае.

Сярод рабочых не вядзецца ніякай культурна-масавай работы. Камендант інтэрната Эпштэйн нічога не робіць.

І не дзіўна пасля гэтага, што на пабудовах Белбудпромтрэста існуе вялікая цякучасць рабочай сілы. Штогод трэст траціць вялікія сродкі на вярбоўку рабочай сілы. Рабочым абяцаюць што ім прадаставяць культурныя інтэрнаты і добрыя ўмовы, але ніхто і не думае выконваць гэтыя абяцанні.

Пра ўсё гэта добра ведаюць кіраўнікі трэста, але нічога не робяць, каб навесці парадак у інтэрнатах.

ДАДЗІОМАЎ.

ЗНЯВАГА ДА ГІСТАРЫЧНАГА МІНУЛАГА

ПРАПОЙСК. За 12 кілометраў ад раённага цэнтра, каля вёскі Лясной, 28 верасня 1908 года быў адкрыт помнік, прысвечаны перамозе ў 1708 годзе войск пятроўскіх часоў над шведамі, якія ўварваліся на тэрыторыю рускай дзяржавы. Гэта дата апісваецца ў вядомым рамане пісьменніка А Талстога «Пётр першы». Сам помнік прадстаўляе сабою архітэктурную рэдкасць.

Аднак, ніхто не клапоціцца, каб захаваць рэдкі помнік гераічнага мінулага нашага народа. Мемарыяльная дошка помніка валяецца адарваная, з пастаментаў зрываецца мрамар, агарожа разбурана.

А. ШЭУЧЭНКА.

ЗАЦЯГВАЕЦЦА ПУСК ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

На тэрыторыі Жаліўскага сельсавета, Чавускага раёна, яшчэ к 1 мая г. г. было намечана кончыць будаўніцтва электрастанцыі, якая павінна забяспечыць электрасвятлом тры калгасы сельсовета—«1 мая», «Чырвоны Усход» і імя XVII партз'езда.

Калгасы гэтыя самі, па дагаворанасці з Белсельэлектра, забяспечылі будаўніцтва электрастанцыі рабочай і цягавай сілай, на што патрачана нямала працадзён. Але і да гэтага часу электрастанцыя не пушчана.

Зацягнуў пуск электрастанцыі Белсельэлектра, які не забяспечыў станцыю вымяральнікамі, чым парушае заключаны з калгасамі дагавор аб своечасовым сканчэнні будаўніцтва.

РУТМАН.

ДОМ СОЦКУЛЬТУРЫ НА ЗАМКУ

У Пірэвіцкім сельсавеце, Жлобінскага раёна, ужо некалькі месяцаў Дом соцкультуры знаходзіцца пад замком. Загадчык ДСК Іван Гарбачэўскі неахайна адносіцца да сваёй работы. Дом соцкультуры да гэтага часу яшчэ неадрамантаваны — разбітыя вокны, не аштукатураны сцены, няма газет, журналаў, шашак, даміно. Ёсць толькі паломаны більярд. У ДСК ёсць радыёпрыёмнік, але ён папсаваны.

Аб рабоце ДСК і справах Гарбачэўскага пісалася ў раённай і абласной газетах. Але старшыня сельсавета тав. Пажарыцкі, які, да рэчы, сам не цікавіцца культурным адпачынкам працоўных, стаў у яго абарону.

Трэба хутчэй наладзіць работу Дома соцкультуры.

С. ШЭНДРЫКАЎ.

КАЛІ МЫ АТРЫМАЕМ ЗАРПЛАТУ?

Мы, рабочыя арцелі «Чырвоны пільшчык», Ельскага раёна, Палескай вобласці, вось ужо 4 месяцы не атрымліваем зарплаты. На нашы неаднаразовыя патрабаванні старшыня арцелі тав. Гутман дае бестурботны адказ: «Банк грошай не выдае».

Для таго, каб атрымаць аванс 2—3 рублі, прыходзіцца пасля работы затрачваць не менш 8 гадзін. Мы абураны такімі бяздушнымі адносінамі да рабочых з боку кіраўніцтва арцелі.

Рабочыя арцелі «Чырвоны пільшчык».

АБАРОННАЯ РАБОТА АДСУТНІЧАЕ

Пры калгасе «Краіна Совета ў», Голіцкага сельсавета, Рудзенскага раёна, лічыцца асоавіяхімаўская арганізацыя, але яе арганізатар тав. Дзятко В. бяздзейнічае. Ніякай работы сярод членаў Асоавіяхіма ён не праводзіць. Ніхто з членаў Асоавіяхіма не мае нават процівагаза.

Адсутнічаюць вучэбныя вінтоўкі; няма неабходнай літаратуры. У калгасе няма ніводнага значкіста. Такое-ж становішча з абаронай работай і ў астатніх калгасах сельсовета.

С. ДЗЯТКО.



УСТУПІЛІ Ў СТРОЙ ПЕРШЫЯ ЦЭХІ МАНЧЭГОРСКАГА МЕДНА-НІКЕЛЕВАГА КАМБІНАТА. Каб дапамагчы маладым манчэгорскім металургам асвоіць тэхналагічны працэс, у Манчэгорск прыехалі кваліфікаваныя металургі уральскіх заводаў. НА ЗДЫМКУ: група рабочых уральскіх медасплавільных заводаў у Манчэгорску (злева направа) — старшы гаркавы ватаржакета І. С. Масленнікаў (Кіраўград), памочнік майстра канвертарнага аддзялення А. І. Анісімаў (Кіраўград), зменныя майстры канвертарнага аддзялення П. П. Папкоў (Карабаш) і Н. П. Матвееў (Кіраўград).

Фото Б. Федасеева (СФ).

УБОРКА БУЛЬБЫ НЕ АРГАНІЗАВАНА

ПУХАВІЧЫ. Перадавыя калгасы раёна шырока разгарнулі перадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва на хутчэйшае заканчэнне сельскагаспадарчых работ. Калгасы «Пяцігодка», Пудзіцка-Слабодскага сельсавета, «Ударнік», Талькаўскага сельсавета, «XVII партз'езд», Слабодскага сельсавета, і іншыя паспяхова закончылі ўборку бульбы і разлічыліся з дзяржавай па бульбапастаўках.

Аднак, большасць калгасаў раёна ганебна зацягвае ўборку бульбы. На 10 кастрычніка план уборкі выканан толькі на 58,5 проц.

Калгас «Новае жыццё», Балоцкага сельсавета, з 87 гектараў бульбы ўбраў толькі 30. Якасць уборкі — нізкая У глебе астаецца шмат бульбы. Праца на ўборцы арганізавана дрэнна.

Марудзяць з уборкай бульбы ў сельгасарцелі «Іскра», гэтага-ж сельсавета. Тут сур'ёзна не заняліся арганізацыяй працы, не арганізаваны звенні. Між брыгадамі і ўнутры брыгад не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва. У выніку ў калгасе выканана толькі 40 гектараў бульбы з 84.

Не лепш з уборкай бульбы і ў калгасах імя Варашылава і «Чырвоны Кастрычнік», гэтага сельсавета. Мала аддае ўвагі ўборцы старшыня сельсавета тав. Сысоў. Ён не аказвае дапамогі калгасам, не займаецца арганізацыяй працы ў калгасах.

Дрэнна арганізавана ўборка бульбы і ў калгасе «Культура», Варашылаўскага сельсавета. З 60 калгаснік, якія могуць працаваць на ўборцы, працуюць толькі 20—25. Асабліва дрэнна арганізавана работа ў 3-й брыгадзе (брыгадзір Іван Чмель). На работу выходзяць 5—6 жанчын. Нормы выпрацоўкі сістэматычна не выконваюцца.

У глыбокім прарыве знаходзіцца калгас «Чырвоны Бор», Новасёлкаўскага сельсавета. У калгасе яшчэ не ўбрана больш 50 гектараў бульбы. Надзвычай марудна ўбіраецца бульба і ў радзе іншых калгасаў раёна.

П. КАСКОЎ.

ПАТУРАЮЦЬ ЗРЫЎШЧЫКАМ ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАСТАВАК

КАСЦЮКОВІЧЫ. (Спец. кар. «Звязды»). Перадавыя калгасы раёна на аснове разгортвання сацыялістычнага спаборніцтва заканчваюць выкананне сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Аднак, многія калгасы раёна недапушчальна адстаюць па выкананню паставак.

Зусім нецярпімае становішча з аднаасобніцкім сектарам. На 10 кастрычніка аднаасобнікі раёна выканалі план хлебапаставак толькі на 10,4 проц., малакапаставак — на 9,3 проц. і мясапаставак — на 24,7 проц. Аднаасобныя гаспадаркі 11 сельсветаў раёна яшчэ нават не прыступілі да выканання дзяржаўных планаў па абавязковых пастаўках.

У радзе месц наглядаецца яўны сабатаж дзяржаўных паставак некаторымі аднаасобнымі гаспадаркамі. Напрыклад, аднаасобнікі Е Прымачоў, Р. Палюшын (в. Бароўка) і М. Шуранаў (в. Ліпаўка) да гэтага часу ўпарта не выконваюць сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Аналагічнае становішча наглядаецца ў Тупічынскім сельсавеце. Аднаасобныя гаспадаркі здалі толькі 1,62 цэнтнера хлеба з патрэбных здаць 31,6 цнт. Такое-ж становішча і ў радзе іншых сельсветаў.

Да злосных зрыўшчыкаў дзяржаўных паставак не прымаюцца законныя меры ўздзейнічання.

Слабая агітацыйна-масавая работа, патуранне сабатажнікам — вось прычыны таго, што ў Касцюковіцкім раёне ганебна зрываецца выкананне плана дзяржаўных паставак аднаасобнікамі.

С. КАЗНАЧЭЕЎ.

ДАХОДЫ КАЛГАСАЎ АД ІЛЬНАВОДСТВА

Добры лён вырасцілі ў гэтым годзе калгасы Аршанскага раёна. Ураджай яго значна вышэй мінулагодняга. Некаторыя калгасы атрымалі па 7—8 цэнтнераў ільнасемя і па 6—7 цэнтнераў ільнавалакна з кожнага гектара.

Калгас «Брыгадзір», Шыбецкага сельсавета (старшыня ордэнаносец тав. Палітыка), атрымаў па 6,5 цэнтнера ільнасемя і 7 цэнтнераў ільнавалакна з кожнага гектара пасеваў Калгас «Чырвоныя Яромкавічы», Яромкавіцкага сельсавета, дзе адказнай па ільну працуе ордэнаносец, дэпутат Вярхоўнага Совета БССР тав. П. К. Ціханская, атрымаў у сярэднім па 6,5 цэнтнера ільнавалакна з гектара Калгас «Чырвонае аб'яднанне» — 8 цэнтнераў ільнасемя і каля 7 цэнтнераў ільнавалакна з гектара і т. д.

За лён калгасы атрымліваюць вялікія даходы Калгас «Брыгадзір» толькі за ільнасемя атрымлівае 41 тысячу рублёў прыбытку. Ужо здадзена каля 120 цэнтнераў ільнасемя (план 33). Апрача гэтага калгас мяркуе здаць яшчэ каля 80 цэнтнераў. Толькі ад даходаў, атрыманых за ільнасемя, на кожны працадзень калгасніка прыходзіцца па 2 руб.

Вялікія даходы ад ільну атрымлівае калгас «Чырвонае аб'яднанне» гэтага-ж сельсавета План здачы ільнасемя калгас выканаў на 324 процанты. За ільнасемя атрымалі 6.625 рублёў. Калгас «Чырвоныя Яромкавічы» за планавую здачу ільнасемя атрымаў 4.669 рублёў і прэміяльных надбавак за звышпланавую здачу — 3384 рублі.

Вялікія даходы за ільнасемя атрымліваюць калгасы «Прамень социялізма», Кралівенскага сельсавета, «Чырвоны чыгуначнік», Веравопшанскага сельсавета, імя Варашылава, Межаўскага сельсавета і т. д. Гэтыя даходы — яркі доказ таго, што лён з'яўляецца важнейшай крыніцай росту заможнасці і багацця калгаснікаў.

Ал. КАЗЕЙ.

БІЯГРАФІЯ ПАЭТА

Нядаўна Дзяржлітвыдат выпусціў XIII том поўнага збору твораў Маякоўскага. Сюды ўключаны: аўтабіяграфія паэта, даты жыцця і работы, некалькі вершаў, не ўвайшоўшых у папярэднія выпускі, бібліяграфічны і алфавітны ўказальнік да ўсяго збору яго твораў.

Многія папракалі паэта: «Ваша біяграфія не вельмі сур'ёзна». Маякоўскі адказаў: «Я яшчэ не заакадэмічыўся і не прывык няньчыцца са сваёй персонай, ды і справа мая мяне цікавіць, толькі калі гэта весела. Уздым і ападанне многіх літаратур, сімвалісты, рэалісты і т. д., наша барацьба з імі—ўсё гэта, ішоўшае на маіх вачах: гэта частка нашай, вельмі сур'ёзнай гісторыі. Гэта патрабуе, каб аб ім напісаць. І напішу».

Замысел не быў ажыццёўлен. Але і скупыя, праўдзівыя, вясёлыя запісы аб сваім жыцці, якія ён нам пакінуў, узбагачаюць чытача веданнем складанага і цяжкага шляху паэта, дапамагаюць устанавіць адзінства паміж праўдай яго творчасці і праўдай яго быцця.

«Я — паэт. Гэтым і цікавы. Аб гэтым і пішу. Аб астатнім таксама — толькі калі гэта адстаялася словам». Так пачынае Владзімір Маякоўскі сваю аўтабіяграфію. Уся яго творчасць — вершы, паэмы, агітплакаты, п'есы, феерыі — гэта і ёсць «адстаяўшаеся словам» вялікае жыццё паэта. Заўсёды і ва ўсім ён быў самім сабой. Сярод агульнага хору паэтычных галасоў можна было беспамылкова вызначыць яго—Маякоўскага—магутны голас. Ён быў не паэтычным «афарміцелем» дум і пачуццяў народа, а іх выразіцелем, іх натхнёным глашатаем. Так мыслію ён, так перажываў ён. Любая тэма, якая хвалявала краіну, была яго асабістай і інтымнай тэмай. Ён не мог маўчаць, не мог не адгукнуцца. Кожнае вынашанае ім слова было блізка і дорага мільёнам. Яны знаходзілі ў ім сябе, яны адчувалі ў ім біенне свайго сэрца.

Для Бялінскага Пушкін быў Расіяй, поўным прадстаўніком жыцця свайго народа.

Такім быў і Маякоўскі. Мір яго душы — гэта і наш мір. Мы выяўляем яго пастаянна і ў мальбе паэта да сваёй улюблёнай і ў яго да краёў перапоўненых шчасцем страфах.

Плюгавенькія паэтычныя дзялыцы і пралазы, рвачы і выжыгі смелі папракаць Маякоўскага ў «ячестве» і «эгоцентризме». Час паказаў, чым у сапраўднасці было ўласна суб'ектыўнае «Я» Маякоўскага.

Читайте,
заучивайте,
я —
гражданин
Советского Союза.

Іменна гэтыя словы сказаў з высокай трыбуны Сесіі Вярхоўнага Совета СССР народны выбраннік дэпутат Образцоў, каб найбольш поўна і ярка выразіць гордасць і гонар совецкіх патрыётаў.

«Дзяржава — гэта я», — гавораць мільёны совецкіх людзей, асазнаўшых сябе гаспадарамі краіны, яе будаўнікамі і вартавымі.

Пролетарии
приходят к коммунизму
низом —
низом шахт,
серпов
и вил, —
я ж
с небес поэзии
бросаюсь в коммунизм,
потому что
нет мне
без него любви, —

пісаў аб сабе Маякоўскі.

Паэзія была для яго справай жыцця, зброяй у барацьбе. Яна—яго мышленне, і палкасць, і воля, яго імкненне і надзея. Усё ў ёй біяграфічна, належыць яму, звязана з ім.

Маякоўскаму было 12 год. «905-ы год. Не да вучэння... Для мяне рэвалюцыя пачалася так: мой таварыш, повар святчэнніка—Ісідар, ад радасці босы ўскочыў на пліту — забілі генерала Аліханава. Усмірыцель Грузіі. Пайшлі дэманстрацыі і мітынгі. Я таксама пайшоў. Добра...». Мы чытаем, і нам прыходзіць на памяць:

...а я
ежедневно
и наново
опять вспоминаю
все синяки
от плеток
всех Алихановых.

«906-ы год... Пасля пахавання бацькі — у нас 3 рублі... З харчамі дрэнна. Пенсія — 10 рублёў у месяц. Я і двое сястры вучымся... Грошай у сям'і няма. Прышлося выжыгаць і рысаваць». Мы пазнаем ісцінную цану яго слоў:

Я
жирных
с детства привык ненавидеть,
всегда себя
за обед продавая.

У чацвертым класе гімназіі Маякоўскі знаёміцца з «Анты-Дзюрынгам». Прачытана прызначаная «для нелегальнага прасоўвання» сіненькая ленінская брашура «Дзве тактыкі». Маякоўскі чытаў з захапленнем і Маркса. «Няма твораў мастацтва, — упамінае Маякоўскі-падлетак, — якім-бы я захапляўся больш чым «Прадмовай» Маркса». Напісан першы поўверш у школьным нелегальным журнальчыку «Порыв».

1908 год. Пятнаццацігадовым падлеткам уступае ён у партыю РСДРП (большэвікоў). Прапагандысцкая работа сярод булачнікаў, шаўцоў, наборшчыкаў. Першы арышт. Выпусцілі «на жыхарства ў сям'ю» і адначасова аддалі пад асобы нагляд паліцыі. Затым другі арышт, трэці арышт, 11 месяцаў сідзі ў Бутырскай турме.

Тады мы ўспамінаем паэму «Владзімір Ільіч Ленін».

Пролетариат —
неуклюже и узко
тому,
кому
коммунизм — западня.
Для нас
это слово —
могучая музыка,
могущая
мёртвых
сражаться поднять.

І далей:

Мозг класса,
дело класса,
сила класса,
слава класса —
вот что такое партия.

Для Маякоўскага гэты вывад быў не абстрактным умазаключэннем.

«Мая рэвалюцыя», — так ён назваў у сваёй аўтабіяграфіі Вялікую социялістычную рэвалюцыю, якой служыў нязменна і верна. Яе «прабіты кулямі сцяг» славіў ён і радком, «нідзе не быўшага ў найме», і справамі, і кроўю.

Літаратурная аўтабіяграфія Маякоўскага абрываецца запісам «1928 год». Апошнім вялікім творам да гэтага часу была паэма «Хорошо». Паэт лічыў яе «программной вещью». Ён не пераўвялічваў яе значэнне. Тут ён выявіў сябе, раскрыў мір свайго відзення і адчування з новай паэтычнай сілай.

Такая біяграфія паэта. Паэзія — адзінае, што складала яго жыццё. Але паэзіяй была для яго наша айчына, яе лёс, урачыстасць народнай — яго, Маякоўскага, — справы. Іменна гэта зрабіла яго паэтам велізарных маштабаў, праўдзівых, маладых пачуццяў, лепшым і таленавіцейшым паэтам цэлай эпохі.

Маякоўскі быў і астаецца главой совецкай паэзіі.

С. ТРЭГУБ.

*Да пытання аб сучаснай беларускай арфаграфіі *)*

Пытанне аб упарадкаванні беларускага правапіса, узнятае на старонках «Звязды», заслугоўвае велізарнейшай увагі.

Арфаграфічная граматнасць — састаўная частка культуры. Вось чаму школьнікі і дарослыя імкнуцца і павінны ведаць арфаграфію, каб больш паспяхова авалодваць вышынямі сучаснай навукі і тэхнікі, мастацтва, палітыкі і эканомікі.

Таварыш Сталін у палітычнай справаздачы ЦК XVI з'езду партыі гаварыў:

«Трэба даць нацыянальным культурам развіцца і разгарнуцца, выявіўшы ўсе свае патэнцыі, каб стварыць умовы для зліцця іх у адну агульную культуру з адной агульнай моваю».

Адным з важнейшых шляхоў узбагачэння беларускай мовы з'яўляецца яе далейшая кроўная сувязь з брацкай рускай мовай

Вось чаму зразумела імкненне беларускага народа далучыцца да вялікай рускай мовы, да найбагацейшай рускай культуры. Адсюль, неабходна ліквідаваць штучныя перагародкі, уведзеныя ворагамі народа, паміж беларускай і рускай мовамі.

Улічваючы тое, што сучасны беларускі правапіс быў свядома заблытан агентамі польскага фашызма — трацкісцка-бухарынскімі і нацыянал-фашысцкімі бандытамі,—якія прабраліся на адказныя пасты партыйных, совецкіх і культурных устаноў нашай рэспублікі, неабходна ўважліва сур'ёзна крытычна пераглядзець яго (пачынаючы ад прынцыповых асноў канчаючы так званымі «дробязямі».

Я падтрымліваю думку аб скасаванні так званага фанетычнага прынцыпа ў напісанні ненаціскных **О, Е.** Напісанне іх па марфалагічнаму прынцыпу зрабіла-б пажаданую рэволюцыю ў нашым правапісе Многія паспяшылі ўбачыць у гэтым праекце замах на беларускую мову Яны, упадаючы ў роспач, пытальна пратэстуюць: «Што-ж пасля гэтага астанецца ад нашай роднай мовы?!» Дазволім сабе запытаць у пратэстуючых:

«А ці ведаеце вы, у чым-жа заключаецца спецыфіка нашай роднай мовы?» Дапаможам ім, што — не ў аканні, і тым больш — не ў адлюстраванні яго на пісьме.

У чым сутнасць так званага фанетычнага прынцыпа? (Мы падкрэсліваем — «так званага») «Спачуваючыя» яму звычайна адказваюць: «Як чуецца, так і пішацца» Што гэта значыць — «як чуецца»? Ці мала што можа «пачуцца» у рэзультаце чыйго ці свайго асабістага вымаўлення? Якія пры гэтым могуць быць нормы правапіса?

На пытанне аб прычыне дапушчанай памылкі звычайна вылятае зручны адказ, які не патрабуе ведаў па граматыцы, мове: «Бачыце, як чуецца, так і пішацца». І кожны «мае права» чуць па-свойму і пісаць па-свойму Дзе-ж тут прынцып? Выходзіць, што так званы фанетычны прынцып з'яўляецца беспрынцыпным прынцыпам, а пасутнасці—і не прынцыпам. Вось на якім лжывым шляху стаіць беларуская арфаграфія.

Кожны гук чалавечай мовы кожным вымаўляецца па-рознаму Вымаўленне яго залежыць ад своеасаблівасці пабудовы моўнага апарата чалавека, ад псіхічнага стану яго, нават ад акружаючага асяроддзя і т. д. І калі быць да канца паслядоўным прыхільнікам так званага фанетычнага прынцыпа, патрэбна было-б наш алфавіт павялічыць да казачных размераў. Вось да якой бяссэнсіцы давяла-б наіўная пагоня за гэтым прынцыпам Выходзіць, што гукавы склад нашай мовы далёка недакладна адлюстроўваецца на пісьме, нават пры існаванні так званага фанетычнага прынцыпа.

Вядома, што фанемы і літары служаць сродкам дыферэнцыяцыі значэння слоў. Возьмем прыклад: «Валы бягуць» **Хто** ці **што** бяжыць? — Ці жывёлы, ці хвалі? Незразумела. Так атрымліваецца пры напісанні па так званаму фанетычнаму прынцыпу Такога непаразумення не можа быць пры захаванні этымалагічных галосных: «Валы бягуць» і «Волы бягуць».

Звернемся да марфалагічнага прынцыпа. У чым яго сутнасць? Марфалагічны прынцып імкнецца перадаць значымыя часткі слоў (марфемы) аднолькава, не гледзячы на тое, у якім палажэнні яны бываюць і як яны вымаўляюцца. Напрыклад, у рускай мове корань **вод (вод-а)** у залежнасці ад палажэння ў слове можа вымаўляцца: **(вод), (вот—), (вад), (въд—),** параўн. **(воды), (паводкъ), (вада), (въдавос)** і т. д., але на пісьме заўсёды пішацца толькі **вод**. Гэтым дасягаецца адзінства зрокавага вобраза слова і яго марфалагічных частак, што ў значнай меры аблягчае працэс чытання.

Падобнае вымаўленне марфемы **вод—** (воды) мае месца і ў беларускай мове, аднак, пры пісьме існуе дзве бухгалтэрыі: і **вод—**(воды), і **вад—**(вала).

Патрэбна адзначыць, што і графіка украінскай мовы перадае корань **вод—** нязменна: воды вода і т. д.

Такім чынам, пры ажыццяўленні данага праекта мы мелі-б наступнае: у пераважнай большасці выпадкаў словы з ненаціскнымі «о», «е» перадаюцца на пісьме аднолькава ва ўсіх мовах усходніх славян, г зн рускай, беларускай і украінскай Гэта было-б вялікім шагам па шляху да інтэрнацыяналізацыі мовы наогул, правапіса ў прыватнасці.

Неабходна было-б марфалагічны прынцып прымяніць і ў адносінах да правапіса зычных, у прыватнасці да правапіса прыставак **з—, уз—, без—, раз—, цераз—,** захоўваючы іх нязменна, нават і перад глухімі зычнымі. Дарэчы, гэта мяркуецца ў праекце аб упарадкаванні рускага правапіса.

Прадоўжым спіс недарэчнасцей, перакручванняў і скажэнняў, што ёсць у беларускім правапісе.

Іншамоўныя злучэнні **іо** (не пад націскам), а таксама **іа** перадаюцца праз **ія**, а пасля зацвярдзелых **ж, дж, ч, ш, ц, р** і пасля **д** і **т** — праз **ыя**; злучэнне **іо** пад націскам перадаецца праз **іё** (ыё): «**біялогія**», «**геніяльны**», «**соцыялізм**», «**біёлаг**», «**стадыён**» і т. д.

Я прапаную іншамоўныя злучэнні **іо, іа** незалежна ад націска перадаваць нязменна, а пасля зацвярдзелых — праз **ыо, ыа,** напрыклад: «**біологія**», «**аксіома**», «**філіал**», «**перыод**», «**соцыалізм**».

Трэба падумаць аб іншамоўных словах, якія пачынаюцца на **д, т** або маюць **д, т** у аснове і пасля якіх у рускай арфаграфіі стаяць літары **и, е** (дивизия, партия, делегат, аплодировать) Цвёрдае вымаўленне **д, т** у падобных словах — рэдкая з'ява ў жывой мове І гэтыя выпадкі ўзніклі толькі пад уплывам правапіса Відаць, што ўсё гэта штучна Яркай ілюстрацыяй гэтай штучнасці можа быць само разыходжанне ў напісанні: у правапісе выдання 1934 г. (22 стар.) сустракаем «**камандзіраваць**», а ў новай граматыцы 1938 г. (29 стар.)—«**камандыроўка**».

Зусім натуральна, што засмечанне правапіса з'явілася прычынай парушэння нармальнага вымаўлення

У пастанове СНК БССР «Аб зменах і спрашчэнні беларускага правапіса» ад 1933 г запісана: «Увесці ў беларускі правапіс дзеяпрыметнікі незалежнага стану, калі яны азначаюць социяльны сэнс...» Так, можна было ўжываць: «**пануючы клас**», але забаранялася: «**неўміручая радасць**»; замест гэтага толькі «**раілася**»: «**радасць, якая не ўмірае**».

Гэты пункт павінен быць рашуча адкінут, бо ён, звужаючы сферу ўжывання дзеяпрыметнікаў, перашкаджае тэндэнцыі беларускай літаратурнай мовы ў справе набыцця гібкасці.

Маркс у пісьме к Энгельсу пісаў, што неабходна дабіваца «ловкости в тех второстепенных оборотах (сюды ўключаюцца дзеяпрыметныя і дзеяпрыслоўныя абароты — **П. Д.**), без которых, однако, немыслимо живо писать» («Сочинения», т. XXI, стар. 488).

Такім чынам, круг ужывання дзеяпрыметнікаў павінен быць пашыран. Пры гэтым трэба ўнікаць сунадзення форм дзеяпрыметнікаў мужчынскага роду незалежнага стану ў назоўным склоне адзіночнага ліку з адпаведнымі дзеяпрыслоўямі, замяняючы іх апісальнымі выразамі.

Неабходна прыглядзецца да мэтазгоднасці наступнага правіла: у словах іншамоўнага паходжання суфікс **ір** (**іг**) прапускаецца («аналізаваць», «фармуляваць»); суфікс **ір** пішацца толькі ў тых выпадках, калі без **ір** слова змяняе сваё значэнне («суміраваць», «вар'іраваць») І навошта без асаблівай патрэбы «вараваць» суфікс **ір** у шмат якіх словах? Няўжо толькі таму, што ў рускай мове ён больш устойлівы?

Ні правапіс, ні аўтары новай граматыкі да канца не распрацавалі правапіс меснага склона адзіночнага ліку назоўнікаў першага і другога скланення. Словы «тата», «Ціт», згодна існуючага правіла, павінны мець формы «таце», «Ціце». Але-ж гэта смешна! На самай-жа справе трэба пісаць: «тату», «Ціту».

Вось чаму прыняць актыўны ўдзел у абмеркаванні новага праекта беларускага правапіса — кроўны абавязак кожнага Правапіс павінен быць уведзен усур'ёз і надоўга.

П. ДЗІК.

студэнт 4-га курса літфака Менскага педінстытута імя Горкага.

*) Друкуецца ў парадку абмеркавання.

СЕНАЦКІЯ ВЫБАРЫ У ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 14 кастрычніка. (БЕЛТА). На 23 кастрычніка ў Францыі назначаны сенацкія выбары.

Па канстытуцыі Французскай рэспублікі сенатары выбіраюцца на 9-гадовы тэрмін, прычым з агульнага саставa 314 сенатараў трэцяя частка перавыбіраецца праз кожныя 3 гады. У бягучым годзе выбары ў сенат адбываюцца ў 30 дэпартаментах (першых па алфавіту). Усяго будзе выбрана 97 сенатараў.

Сярод сенатараў, паўнамоцтвы якіх выходзяць у бягучым годзе, ёсць рад вельмі відных дзеячоў: міністр унутраных спраў Альбер Саро, міністр земляробства Анры Кэй, былы міністр фінансаў Марсель Рэнье, старшыня сенатарскай камісіі па замежных справах Анры Беранжэ і інш.

У БЕРЛІНЕ ПАДРЫХТОУВАЮЦЬ „ПРАБЛЕМУ ЭЛЬЗАС-ЛАТАРЫНГІІ"

ПАРЫЖ. 15 кастрычніка. (БЕЛТА). Як вядома, Гітлер выступаў з неаднаразовымі заявамі аб тым, што «пытанне аб Эльзас-Латарынгіі вырашана» і што Германія «не мае ніякіх прэтэнзій да Францыі». Аднак, як паведамляе з Берліна добра паінфармаваны французскі журнал «Эроп нувель», зараз пасля мюнхенскай канферэнцыі ў германскіх кругах разглядаюць пытанне аб тым, якім чынам Германія зноў зможа паставіць у парадак дня праблему Эльзас-Латарынгіі.

Калі германскай агентуры ўдасца арганізаваць «жаданне хоць-бы часткі насельніцтва Эльзас-Латарынгіі быць апытанай у парадку плебісцыта», то ў гэтым выпадку, як даюць зразумець у германскіх кругах, «Германія не зможа астацца роўнадушна».

СТАНОВІШЧА НАРОДНАГА ФРОНТА ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 14 кастрычніка. (БЕЛТА). Стварыўшаеся становішча ў сувязі з рэзалюцыяй кіраўніцтва партыі радыкал-соцыялістаў, маючай нападкі на комуністаў, будзе абмяркована нацыянальным камітэтам народнага фронта, які збярэцца, магчыма, яшчэ сёння. «Попюлер» публікуе сёння маніфест «Лігі правоў чалавека» (адной з відных арганізацый, уваходзячых у народны фронт, асуджаючай мюнхенскую капітуляцыю і заяўляючай, што «мюнхенскае пагадненне ставіць пад пагрозу мір і дэмакратычны рэжым»).

«Се суар» публікуе заяву, зробленую сакратаром французскай компартыі тав. Жакам Дзюкло. «Компартыя, — сказаў тав. Дзюкло. — ганарыцца сваім галасаваннем супроць ганебнай мюнхенскай капітуляцыі і ўпэўнена, што яна выказала думку, раздзяляемую з гэтага часу большасцю партый і арганізацый народнага фронта, а таксама большасцю насельніцтва Францыі. Компартыя астанецца непахісна вернай народнаму фронту барацьбы за хлеб, свабоду і мір. Яна звернецца да нацыянальнага камітэта народнага фронта, дзе прадстаўлены, апрача партыі радыкалаў і компартыі, таксама соцыялістычная партыя, Усеагульная канфедэрацыя працы і «Ліга правоў чалавека», і патрэбуе ў камітэта народнага фронта сказаць, ці з'яўляецца згода з мюнхенскай капітуляцыяй неабходнай умовай прыналежнасці да народнага фронта, як гэта спрабуе дэкрэтываць Далад'е».

АБ'ЯДНАННЕ ПРОФСАЮЗАЎ У ЧЭХАСЛАВАКІІ

ПРАГА, 14 кастрычніка. (БЕЛТА). Кіраўніцтва профсаюзаў металістаў (соцыял-дэмакратычнага і чэшскіх соцыялістаў) паведамляе аб зліцці абодвых арганізацый. Аб'яднаны саюз налічвае 150 тысяч членаў. У бліжэйшыя дні прадстаіць уключэнне ў новае аб'яднанне Чырвонага профсаюза металістаў.

Паход чэхаславацкай рэакцыі супроць компартыі

ПРАГА, 14 кастрычніка. (БЕЛТА). Аграрны і фашысцкі друк прадаўжаюць шалёную кампанію супроць комуністычнай партыі, патрабуючы яе неадкладнага роспуску.

Зусім відавочна, што ўзняўшая галаву рэакцыя рыхтуе роспуск комуністычнай партыі і іншых рэвалюцыйных арганізацый рабочага класа. У журналісцкіх колах сцвярджаюць, што Гітлер патрэбаваў ад чэхаславацкага ўрада неадкладнага роспуску компартыі і закрыцця комуністычнага друку.

Славацкі ўрад рыхтуе дэкрэт аб роспуску соцыял-дэмакратычнай партыі.

Патрабаванні Венгрыі

ПАРЫЖ, 15 кастрычніка. (БЕЛТА). У сувязі з разрывам чэхаславацка-венгерскіх перагавораў у Комарна адзін з членаў славацкага аўтаномнага ўрада Дурчанскі заявіў карэспандэнту агенцтва Гавас у Братыславе: «Раней, чым перадаць вырашэнне праблемы на ўгледжанне дзяржаў, мы паспрабуем зноў завязаць прамыя перагаворы з Венгрыяй. Не выключана, што мы прыбегнем да трэцяй дзяржавы і папросім яе выступіць у ролі пасрэдніка паміж намі». Па словах Дурчанскага, у Варшаву хутка адправіцца Сідор (агент польскага фашызма ў Чэхаславакіі), «дзе ён, быць можа, прадпрыме перагаворы на гэты конт».

«Сучаснае становішча рэчаў, — заявіў далей Дурчанскі, — малюецца ў наступным выглядзе: венгерская дэлегацыя прадставіла план, згодна якому Славакія павінна была ўступіць 11.268 кв. кілометраў сваёй тэрыторыі з 1.120 тыс. жыхароў. Закарпацкая Украіна павінна была аддаць Венгрыі па гэтаму плану 1.982 кв. кілометра з насельніцтвам у 218 тыс. чалавек. Такім чынам, перадаючы Венгрыі 670 тысяч венграў, Славакія і Закарпацкая Украіна з свайго боку страціла-б больш 650 тыс. славакаў.

Славацкая дэлегацыя прапанавала ўступіць Венгрыі 5.784 тыс. кв. кілометра з 395 тыс. жыхароў, сярод якіх 45 тыс. славакаў.

Венгерская дэлегацыя адмовілася весці перагаворы на гэтай базе».

ДЭМАНСТРАЦЫЯ УКРАІНСКІХ НАЦЫЯНАЛІСТАЎ У ПОЛЬШЧЫ

ВАРШАВА, 14 кастрычніка. (БЕЛТА). Па паведамленню польскіх газет, 11 кастрычніка ў Львове праходзілі бурныя дэманстрацыі украінскіх нацыяналістаў, якія закончыліся сутычкамі з паліцыяй і польскай фашысцкай моладдзю. Дэманстрацыі прадаўжаліся да позняга вечара. Адбыўшыяся на гэтай глебе сутычкі ў Львове закончыліся пагромам украінскага насельніцтва ў горадзе.

Повадам да выступлення украінскіх нацыяналістаў у Львове паслужыла стварэнне «аўтаномнага ўрада Закарпацкай Украіны» ў Чэхаславакіі.

Трэба адзначыць, што па пытанню аб Закарпацкай Украіне наглядаюцца рэзкія рознагалоссі паміж украінскімі і польскімі фашыстамі. У той час, як польскія фашысты патрабуюць перадачы Закарпацкай Украіны Венгрыі, украінскія фашысты высоўваюць патрабаванні стварэння «незалежнай Карпата-Украінскай рэспублікі». «У гэтым пытанні, — падкрэсліваюць польскія газеты,—пазіцыя украінскіх нацыяналістаў поўнасцю супадае з пазіцыяй германскага фашызма».

АДСТАУКА РУМЫНСКАГА МІНІСТРА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АБАРОНЫ

БУХАРЭСТ, 15 кастрычніка. (БЕЛТА). Міністр нацыянальнай абароны генерал Арджэшэану і намеснік міністра генерал Глатц падалі ў адстаўку. Адстаўка прынята каралём. Па паведамленню газеты «Курэнтул», адстаўка Арджэшэану і Глатца выклікана тым, што засядаўшы 13 кастрычніка ваенны совет прызнаў нездавальняючай работу дэпартамента міністэрства, ведаючага ўзбраеннем краіны. Ваенны совет рашыў стварыць новае міністэрства аснашчэння арміі.

Міністрам нацыянальнай абароны назначан камандзір корпуса Чыуперка, а міністрам аснашчэння арміі — дывізіённы генерал Якобічы.

ПРАМОВА НЕГРЫНА

ПАРЫЖ, 15 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, глава іспанскага ўрада Негрын выступіў у Барселоне з прамовай па радыё, у якой сказаў: «Чым далей прадаўжаецца замежная інтэрвенцыя ў Іспаніі, тым большую небяспеку прадстаўляе яна для ўсеагульнага міру. Цяпер ужо нават самі інтэрвенты не адважваюцца адмаўляць факта інтэрвенцыі. Урад рэспубліканскай Іспаніі абвясціў, што ён адклікае з арміі ўсіх іншаземных добраахвотнікаў, а для доказу сваёй шчырасці запрасіў міжнародную камісію для кантролю. З гэтай ініцыятывай рэспубліканскай Іспаніі нельга параўнаць чарговы фарс інтэрвентаў, якія эвакуацыю хворых і раненых італьянцаў спрабуюць выдаць за адкліканне з Іспаніі іншаземных войск».

Гаворачы аб праектах пасрэдніцтва ў Іспаніі, Негрын заяўляе, што «ні аб якім пасрэдніцтве не можа быць і гутаркі паміж Іспаніяй, якая змагаецца за сваю свабоду, і захватчыкамі. Іспанія ніколі не пойдзе на капітуляцыю. Мы будзем змагацца да апошняга, але не дапусцім расчлянення Іспаніі. Калі будзе адноўлена ў адносінах рэспубліканскай Іспаніі міжнароднае права, то вайна закончыцца ў некалькі тыдняў і мір будзе адноўлен».

ЗАЯВА Ю ХАНЬ-МОУ

ШАНХАЙ, 15 кастрычніка. (БЕЛТА). Па паведамленню з Кантона, камандуючы войскамі правінцыі Гандун Ю Хань-моу заявіў, што правінцыя добра падрыхтавана да абароны. Утаржэнне японцаў у Паўднёвы Кітай ёсць прамы рэзультат іх няўдач на фронце Янцзы, і яно не з'явілася нечаканым для кітайскіх улад. Таму гуандунскімі ваеннымі ўладамі былі своечасова прыняты меры па ўзмацненню абароны правінцыі. У асаблівасці ўмацавана берагавая лінія правінцыі Гуандун. У рэзультаце цеснага супрацоўніцтва арміі і насельніцтва японцы сустрэнуць сур'ёзнае супраціўленне. Кожны вяршок тэрыторыі будзе ўпарта абараняцца кітайцамі, не гледзячы на неміну чыя афяры.

Па даных друку ў Кантоне пануе спакойства і поўны парадак.

10 кастрычніка ў НКШЗ адкрылася нарада жанчын-ініцыятараў руху за авалоданне тэхнікай кіравання паравозам і актывістак жонак чыгуначнікаў. НА ЗДЫМКУ: у зале пасяджэння. На першым плане — Т. М. Грэчаноўская—памочнік машыніста жаночай брыгады з дэпо Лубны, Паўднёва-Заходняй чыгункі; справа — машыніст гэтай брыгады Г. П. Тодчук.

Фото Э. Еўзерыхіна (СФ).

ПЕРАДСВЯТОЧНЫ ГАНДАЛЬ

З 30 кастрычніка па 6 лістапада ў Менску, Барысаве і Слуцку арганізоўваюцца вялікія перадсвяточныя міжраённыя кірмашы. У іх прымуць удзел калгасы, калгаснікі і аднаасобнікі ўсіх раёнаў Менскай вобласці.

У Менску перадсвяточны кірмаш будзе праведзен на Чэрвеньскім, Крытым, Суражскім і новаарганізаваным Камароўскім рынках. Гандаль часова будзе праводзіцца і ў пасёлку «Комінтэрн» і на Старажоўцы. Гандлюючыя арганізацыі Менска будуюць дадаткова 25 павільёнаў і ларкоў. Яны мяркуюць вывезці на кірмаш прамысловых тавараў на суму каля 3 мільёнаў рублёў. Чакаецца вялікі прывоз сельскагаспадарчых прадуктаў.

Для лепшага абслугоўвання насельніцтва сталіцы ў перадсвяточныя дні гарадскі аддзел гандлю зацвердзіў парадак работы гандлюючай сеці. З 1 лістапада гандаль ва ўсіх харчовых магазінах будзе павялічан на дзве гадзіны. 7 прадуктовых магазінаў з 4 лістапада будуць працаваць круглыя суткі. У магазінах устанаўляюцца дадатковыя касы. Пашыраецца сець разноснага гандлю. Магазіны шырока будуць практыкаваць прыём папярэдніх заказаў з дастаўкай на-дом.

ПА ГАРАДАХ І РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

⊙ На полі соўгаса імя Молатава, Камарынскага раёна, выбухнуў пажар. Полымя пагражала знішчыць стагі сена на плошчы ў 40 га. Убачыўшы агонь, 60-гадовая работніца Вашчанка Прося пачала тушыць яго, але моцны вецер гнаў агонь па полю на іншыя стагі. На крык жанчыны прыбегла ішоўшая са школы піонерка Расюк Жэня, якая разам з Вашчанка пачалі энергічна вопраткай тушыць агонь. З дапамогаю падаспеўшых рабочых тт. Яцэнка і Асіпенка пажар быў ліквідаван. («Шлях комунізма»).

⊙ З пачатку бягучага года на калгаснае будаўніцтва ў Чавускім раёне выдаткавана 1 614 тысяч рублёў. У калгасах пабудавана 8 клубаў, 3 абодачныя майстэрні, 8 кузніц, 5 дзіцячых яслей, 12 ільнасушыльняў. У калгасе «Большэвік», Хацэтаўскага сельсовета, закончана будаўніцтва цагельнага завода, у калгасе «Перамога», Халмоўскага сельсовета, пабудаван смалакурны завод. («За большэвіцкія калгасы»).

ПІЛЬНЫ КАНДУКТАР

Старшы кандуктар віцебскага рэзерва тав. Карпенка, суправаджаючы поезд № 11-94 на перагоне Смаленск — Лоўкая, выявіў у адным вагоне лопнуўшую рэсору. Тав. Карпенка даў сігнал і спыніў поезд. Дэфект быў ліквідаван. Гэта чацверты выпадак, калі старшы кандуктар Карпенка папярэджвае аварыі.

За праяўленую пільнасць Упраўленне аддзялення чыгункі абвясціла тав. Карпенка падзяку.

СПАРТСМЕНЫ БССР— УДЗЕЛЬНІКІ ЎСЕСАЮЗНАГА КРОСА

18 кастрычніка ў Маскве адбудзецца Усесаюзны крос імя маршала Совецкага Саюза К. Е. Варашылава. Ад БССР у кросе прымуць удзел пераможцы Усебеларускага кроса імя К. Е. Варашылава тт. Барабаншчыкаў (спартыўнае таварыства «Харчавік»), Сінькевіч (інстытут народнай гаспадаркі) і Сцількевіч (спартыўнае таварыства «Навука»).

У ВАЕННАЙ ПРАКУРАТУРЫ БАВА

У ноч на 15 ліпеня 1938 г. вартаўнікі, якія ахоўвалі калгас «Полымя» (вёска Остраў), Рагачоўскага раёна, Худалей, Гаварушка і Чэрнецоў каля калгаснай канюшні заўважылі чалавека, спрабаваўшага ўчыніць падпал канюшні.

Убачыўшы вартаўнікоў, невядомы кінуўся бегчы, але быў затрыман.

Аказалася, што затрыманы — рахункавод гэтага-ж калгаса Парахневіч, былы дзяк, які пралез у калгас у мэтах правядзення шкодніцтва.

Ваенны трыбунал БАВА прызнаў Парахневіча вінаватым у замаху на падпал калгаснай маёмасці і прыгаварыў Парахневіча да 15 год турэмнага зняволення. (БЕЛТА).

КІНО

„ДРУЗЬЯ"

Адным з найбольш важных заваяванняў Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі з'яўляецца ўстанаўленне цеснай і неразрыўнай дружбы паміж многанацыянальных народаў нашай радзімы. Аб гэтым расказвае новы гукавы фільм «Друзья» (сцэнарый Н. Тіханава і П. Арнштама. Пастаноўка Л. Арнштам). Царскае самадзяржаўе ўсяляк распальвала нацыянальную варожасць, нацкоўвала адзін народ на другі, каб затушаваць класавыя супярэчнасці, адцягнуць увагу працоўных ад барацьбы за соцыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

... Кавалачак зямлі асеціна Бета мяжуе з зямлёй інгуша Мусы. Беднасць прымушала іх спрадвечна спрачацца з-за мяжы.

Стыхійная сіла прыроды аднойчы вырашыла іх спрэчкі: ураган развеяў ураджай асеціна і інгуша. Бета і Муса, ідуць прасіць хлеба да князя Анзорава. Але апошні выганяе іх. Каб не памерці галоднай смерцю, яны прабуюць узяць некалькі снапоў з княжаскага поля. Гэта выклікае новую бяду. Аулы займаюцца карнымі атрадамі царскіх апрычнікаў. Бета і Муса вымушаны ўцякаць у горы. Галодныя і змораныя, даведзеныя цяжкім скітаннем да роспачы, яны рашаюць стаць абрэкамі. Тут яны сустракаюцца з большэвіком Аляксеем, які, уцёкшы з царскай ссылкі, па заданню партыі ехаў праводзіць рэволюцыйную работу на Каўказе. Абрэкі хочуць забіць Аляксея. Ён спакойна і проста тлумачыць ім, што гэта — не выхад са становішча, і каб дапамагчы ім схавацца ад ганення, дорыць каня, на якім ехаў сам. Паміж Аляксеем, Бетай і Мусай завязваецца цесная дружба.

Пехатою, праз горныя перавалы, прабіраецца Аляксей у Кабарду. Там ён сустракаецца з былым пастухом, зараз кіраўніком кабардзінскіх паўстанцаў Умарам. Аляксей — рускі, і Умар, які заўсёды цярпеў крыўды ад рускіх прыгнятальнікаў, з недавер'ем адносіцца да яго.

— Я—рускі,—гаворыць Аляксей, — і ты мне, рускаму, дапамажы схавацца ад рускага цара.

Ён расказвае Умару і паўстанцам аб большэвіках, аб іх барацьбе з царызмам за вызваленне ўсіх працоўных ад класавага і нацыянальнага прыгнёту. Вогненыя словы большэвіцкай праўды запальваюць мяцежнае сэрца Умара і ён становіцца лепшым другам большэвіка Аляксея, а пазней — адным з кіраўнікоў вызваленчай барацьбы кабардзінцаў.

... 1917 год. У Расіі адбылася соцыялістычная рэволюцыя. На Каўказе ўладу захватваюць князі і буйныя чыноўнікі ўкупе з меншавікамі. Яны арганізоўваюць «з'езд» прадстаўнікоў «народа» Каўказа, на якім засядае той-контррэволюцыйны зброд.

Партыя большэвікоў арганізуе ма на барацьбу з мясцовай контррэволю цыяй. Аляксей дзень і ноч працуе насельніцтвам, заваёўвае масы сторану большэвіцкай партыі, ры туецца ператварыць з'езд контррэв люцый ў баявы рэволюцыйны шт паўстаўшага народа. На з'езд прыс ваюць сапраўдныя прадстаўнікі пр цоўных кабардзінцаў, інгушаў, асет казакаў і інш.

Палкая прамова трыбуна рэволюц які выведзен у вобразе Аляксея, біць сваю справу. Са з'езда пра няюцца контррэволюцыйныя горс князі і генералы і абвяшчаецца сов кая ўлада. З'езд пасылае прывіта ную тэлеграму В. І. Леніну.

Барацьба за канчатковую перамо совецкай улады заканчваецца поўн разгромам белагвардзейскіх полч шчаў, у знішчэнні якіх партызанск му атраду пад кіраўніцтвам Аляк дапамаглі падаспеўшыя часці Чыр най Арміі і насельніцтва бліжэйш аулаў.

Так мастацкімі сродкамі кіно па зан адзін з эпізодаў слаўнай гера най барацьбы комуністычнай парт за соцыялістычную рэволюцыю, як паклала пачатак непахіснай ленін сталінскай дружбе народаў СССР.

У фільме не ўказана, што Аляксе гэта С. М. Кіраў. Але глядач адразу бачыць у асобе большэвіка Аляк вобраз незабыўнага любімца совецка народа, палкага трыбуна рэволю Сяргея Міронавіча.

Народны артыст рэспублікі Б. бачкін змог перадаць не толькі зн няе падабенства тав. Кірава, але і казвае характэрную кіраўскую ма ру жэстаў, перадае прастату і пера наўчасць размоў, палкасць і шч расць прамовы.

Поўнага адабрэння заслугоўвае і заслужанага артыста рэспуб Н. Чэркасава ў ролі Беты, артыст С. Каюкава ў ролі Мусы і К. Ду швілі—ў ролі Умара.

Неапраўдана мала месца адведзе для ролі баявой падругі Аляксея Веры і для ролі сястры Мусы Шуанэт. Гледачу незразумела, п якіх абставінах завязалася цес дружба паміж Шуанэт і маладым закам Назаркам. У першай палове к ціны яна плюе яму ў вочы, а ў ке цы фільма ідзе разам з ім у бой.

Не гледзячы на некаторыя неда пы, фільм «Друзья» глядзіцца з вя кай цікавасцю. Ён хвалюе гледача з'яўляецца значнай перамогай сов кай кінематаграфіі.

Г. ТАРАН
Ф. КАНСТАНЦІНАЎ

КІНОФЕСТЫВАЛЬ У ГОНАР КОМСАМОЛА

У БССР пачаўся кінофестываль, прысвечаны XX-годдзю ВЛКСМ. Працоўныя 8 раёнаў рэспублікі, у тым ліку 6 пагранічных раёнаў — Дрысенскага, Ілешчаніцкага, Любаньскага і інш. — атрымаюць магчымасць азнаёміцца з лепшымі творамі совецкай кінематаграфіі. У раёны накіраваны для дэманстравання ў часе фестываля карціны «Багатая нявеста», «Бялее парус адзінокі», «Дзяцінства Горкага», «Граніца на замку», «Балтыйцы», «Дачка радзімы», «Прафесар Мамлок».

Фільмы будуць паказаны не толькі ў раённых цэнтрах, але і ў буйных сельсоветах і калгасах.

У фестывалі прымуць удзел таксама 16 гукавых аўтакіноперасовак, якія абслужаць гледачоў у самых аддаленых пунктах Палескай і іншых абласцей рэспублікі.

АЛІМПІЯДА ВУЧНЁЎСКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

МАГІЛЕЎ. (Кар. «Звязды»). З вялі поспехам прайшла гарадская алімп да мастацкай самадзейнасці вучн прысвечаная XX-годдзю ВЛКСМ. алімпіядзе ўдзельнічалі самадзейн вучнёўскія калектывы большасці ш горада, а таксама калектывы выхав цаў дзіцячых дамоў.

Асаблівае захапленне выклікаў д пячы ансамбль песні, пляскі і дэк мацыі 14-й школы, якім кіруе выкл чык спеваў тав. Семіжонак. Гэты самбль выканаў рад беларускіх і р кіх народных песень і плясак. Цікав і рознастайнай была паказана маста кая самадзейнасць 6-й, 12-й, 18-й і шых школ. Выхаванцы дзіцячага до № 5 падрыхтавалі да алімпіяды інс ніроўку, прысвечаную XX-годд ВЛКСМ.

Вык. абавязкі адказнага рэдактара
Д. Т. ЛЕБЕДЗЕЎ

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
17 КАСТРЫЧНІКА 1938 г.
адкрыццё сезона
9 памяшканні Бел. Дзярж. яўрэйскага тэатра.
Рэпертуар
НОВЫЯ ПАСТАНОЎКІ
Рымскі-Корсакаў ЦАРСКАЯ НЯВЕСТА
Чайкоўскі ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА
Даргамыжскі РУСАЛКА
Пучыні ЧЫО-ЧЫО-САН
Узноўленыя пастаноўкі
Дзержынскі ЦІХІ ДОН
Пучыні ТОСКА
Верді РЫГАЛЕТО
Герталь МАРНАЯ ПЕРАСЯРОГА (Тщетная предосторожность).
ПРЫМАЮЦЦА ЗАЯЎКІ ў касе тэатра на пастаянныя месцы і калектыўныя паходы з 12 да 2 г. і з 5 да 8 г. веч.

Кінотэатр «Навіны дня»
1. Журнал Маскоўскай студыі кінохронікі № 44.
2. XX год ВЛКСМ.
3. Совецкі Карагай (кінонарыс).

Кінотэатр «Чырвоная зорка» «ДРУЗЬЯ»
Кінотэатр «Інтэрнацыянал» ЗАНГЕЗУР
Кінотэатр «Спартак» ЧАЛАВЕК З РЭСТАРАНА
Дзіцячы кінотэатр ПРАФЕСАР МАМЛОК

СЕННЯ, У 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА У КЛУБЕ ІМЯ СТАЛІНА (рог Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай)—
АДБУДЗЕЦЦА
ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА
РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНАА РМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ.
ПАРАДАК ДНЯ:
1. АБ ПРАДСТАЯЧЫМ УСЕСАЮЗНЫМ ПЕРАПІСЕ НАСЕЛЬНІЦТВА 1939 г. (дакл. — нам. нач. Упраўлення народна-гаспадарчага ўчоту БССР тав. Шындлер)
2. АРГАНІЗАЦЫЙНЫЯ ПЫТАННІ.
ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

Упраўленне сяцей і падстанцый г. Менска
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ І УСТАНОЎ, ШТО
ЗАЯЎКІ НА ІЛЮМІНАЦЫЙНЫЯ УСТАНОЎКІ ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ УРАЧЫСТАСЦЕЙ
павінны быць паданы не пазней 25 кастрычніка
ПАСЛЯ ЎКАЗАНАГА ТЭРМІНУ НІЯКІЯ ЗАЯЎКІ ПРЫМАЦЦА НЕ БУДУЦЬ.
У ЗАЯЎКАХ ПАВІННА БЫЦЬ УКАЗАНА:
1. ДАКЛАДНЫ АДРАС ЭЛЕКТРАЎСТАНОЎКІ.
2. ПАТРАБУЕМАЯ МАГУТНАСЦЬ У КВТ.
3. ПРОЗВІШЧА І ПАСАДА АДКАЗНАЙ АСОБЫ ЗА ЎСТАНОЎКУ.
Усе далучаныя без дазволу УСП электраўстаноўкі будуць разглядацца, як самавольна ўключаныя і будуць адключаны.
ЗАЯЎКІ падаваць па адрасу: Совецкая, 126 — абанементнаму аддзелу Упраўлення сяцей і падстанцый г. Менска.
АДМІНІСТРАЦЫЯ.

ХИМИКО-ФАРМАЦЕВТИЧЕСКАЯ ФАБРИКА ГАЛЕН МОСКВА
ПАТРАБУЙЦЕ ВА ЎСІХ АПТЭКАХ І МАГАЗІНАХ САНІТАРЫІ І ГІГІЕНЫ ПРОМТАВАРАЎ
ИОД-ГИПЕРСОЛ
па праф. С. Ф. МАЙКАВУ
Дазв. вучон. мед. советам НКАЗ СССР
ЮД-ГІПЕРСОЛ пераважна назначаецца артэрыясклеротыкам, якія хварэюць сіфілісам, залатухай, парушэннем лімфатычных жалёз, пры хранічным рэўматызме, падагры, пры гіпертаніі, для рассасвання хранічных інфільтратаў і экскудатаў, пры ртутным і свінцовым атручваннях.
БОМ-БЕНГЬЕ
(метола-саліцылавы бальзам) Дазв вучон. мед. советам НКАЗ. Лёгка ўсваяемы скурай, болеўшішаючы сродак пры вострым і хранічным рэўматызме, падагры, мігрэні і т. д.
АЛЛИЛСАТ
Карэлізаваная часночная выцяжка, дазв. НКАЗ. Рэкамендуецца ўрачамі пры агульным артэрыясклерозе з гіпертаніяй і без гіпертаніі, пры атаніі кішэчніка, калітах са схільнасцю да запораў, пры з'явах сардэчнай астмы.
ВАГИЛЕН
Процівазачатачныя шарыкі. Адобрана камісіяй НКАЗ па барацьбе з абортамі.
КАЛЬЦЕКС
новы лячэбны папярэджваючы сродак супроць грыпа, адобр. клінікай і дазволена НКАЗ.
ОФТАЛЬМОЛЬ-КУПРУМ
Дазв. НКАЗ.
Гемагезіраваная вочная мазь для лячэння захворванняў кан'юнктывы, трахомы, фалікулярнага катара і інш. хвароб слізістай абалонкі вачей.
АСТМАТОЛ
курыцельны сродак супроць астмы і ўдушлівага кашля. Дзейнічае на дыхацельны цэнтр, аблягчае дыханне і ўстараняе спазмы бронхіяльных мышц.
ПРИ ОТСУТСТВИИ НА МЕСТАХ СООБЩАЙТЕ МОСКВА: ЧУДОВ ПЕР. 8. СОЮЗХИМФАРМТОРГ

Уп. Галоўлітбела № Б—5744. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. М., М., Б.